ТЛУМАЧАЛЬНІК ПАДАТКОВАЙ ДЭКЛАРАЦЫІ 5

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР 8–9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

13 СТУДЗЕНЯ 2021 г. СЕРАДА № 5 (29374)

ЛІЧБА ДНЯ

На Br298 тыс.

аказана дапамога сацыяльным установам з кругласутачным знаходжаннем дзяцей-інвалідаў падчас рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Падчас навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», якая праходзіла з 10 снежня да 10 студзеня, не засталіся па-за ўвагай установы сацыяльнага абслугоўвання з кругласутачным знаходжаннем дзяцей-інвалідаў. Ім аказалі дапамогу прыкладна 140 арганізацый, а таксама каля 30 фізічных асоб. Дзіцячыя дамы-інтэрнаты і рэабілітацыйны цэнтр гасцінна сустракалі наведвальнікаў, праводзілі святочныя ранішнікі, у якіх у тым ліку ўдзельнічалі і работнікі Мінпрацы і сацабароны, падпарадкаваных арганізацый. Яны аказалі дапамогу амаль на Br14,4 тыс.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«БЕЛАРУСЫ — НАРОД З ПРЫГОЖАЙ ДУШОЙ»

Фота БелТА.

У Палацы Рэспублікі ўручылі прэміі «За духоўнае адраджэнне», «Беларускі спартыўны Алімп» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва

Прэмія «За духоўнае адраджэнне» прысуджаецца ў нашай краіне з 1997 года. Мабыць, ні адна культурная падзея ў краіне не робіць большы акцэнт на каштоўнасцях і традыцыях беларускага народа. Яе лаўрэаты атрымліваюць узнагароды з рук беларускага лідара ў пачатку кожнага года падчас Калядных свят. І гэта таксама невыпадкова, як і духоўны складнік прэміі: сярод лаўрэатаў заўсёды імёны святароў і дзеячаў мастацтва рэлігійнага кірунку. Таму разам з Прэзідэнтам на сцэне падчас уручэння прэміі — і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін, кіраўнік самай вялікай па колькасці вернікаў канфесіі ў Беларусі. Сёння гэта свята і той сімбіёз свецкага і духоўнага, які яно ўвасабляе, набыло асаблівы, але, на жаль, сумны лейтматыў — пайшоў з жыцця Уладыка Філарэт. Шанаваны беларусамі Мітрапаліт стаяў каля вытокаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і ўяўляў сабой сапраўдны прыклад служэння краіне і людзям, пра якое шмат гаварыў на ўрачыстасці Прэзідэнт. СТАР. 2

Прэмія «За духоўнае адраджэнне» ўручаецца аднаму з бацькоў-выхавальнікаў дзіцячага дома сямейнага тыпу ўпраўлення па адукацыі Салігорскага райвыканкама Таццяне БАРЫТОЛЬ за значны ўклад у выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

КАРАТКА

- **Па новай праграме «Сямейны капітал» амаль 11,3 тыс. шматдзетных сем'яў адкрыла дэпазітныя рахункі.**
- Мараторый на павелічэнне арэнднай платы будзе дзейнічаць да 1 красавіка 2022 года.
- **У Беларусі завяршаецца кантроль якасці чарговай партыі расійскай вакцыны «Спадарожнік V».**
- Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў студзені—лістападзе вырас на 4,9 %.

ISSN 1990 — 763X

Узровень

МУЛЬТЫПЛІКАТЫЎНЫ ЭФЕКТ

Магілёўская вобласць адзіная ў Беларусі летась перасягнула планку па росце валавога рэгіянальнага прадукту

Ва ўмовах сусветнай пандэміі, закрытых граніц і нявызначанасці знешніх рынкаў зрабіць рывок наперад было складана. Але ўжо па выніках 11 месяцаў 2020 года Магілёўская вобласць стала адзіным рэгіёнам у краіне, дзе тэмп росту ВРП дасягнуў 100,9 % у параўнанні з такім жа перыядам 2019-га. Што стаіць за гэтай лічбай і якія захады дзеля гэтага прымаліся — у размове з намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Русланам СТРАХАРОМ. СТАР. 4

Гарачае «прывітанне» ад печы і абагравальніка

Як засцерагчыся ад пажару?

Сіноптыкі абяцаюць, што напрыканцы тыдня да нас завітаюць сапраўдныя арктычныя маразы. Слупок тэрмометра можа апусціцца ў некаторых раёнах ажно да 25 градусаў марозу! У такое надвор'е і з дому не асабліва хочацца кудысьці выходзіць.

Але чым больш часу людзі бавяць у чатырох сценах, тым большая і рызыка пажару. Статыстыка 2021-га прымушае задумацца. За першыя дванаццаць дзён у краіне адбыліся 162 пажары, на якіх загінулі 28 чалавек.

— Што зімой, што летам структура пажараў і гібелі на іх людзей у цэлым змяняецца не вельмі моцна, — каментуе сітуацыю **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Асноўная прычына ўзнікнення пажараў — гэта неасцярожнае абыходжанне з агнём. Па нашых падліках, на яе прыпадае каля 40 працэнтаў ад агульнай колькасці ўзгаранняў. І пераважная большасць з іх — неахайнасць падчас курэння. Склалася так, што чатыры з кожных пяці ўзгаранняў узнікаюць у жылым фондзе, прычым пераважная большасць з іх прыходзіцца на сельскую мясцовасць. Кожны дзявяты пажар мае пад сабой алкагольную падаплёку. Больш за тое, калі казаць пра гібель людзей падчас такіх надзвычайных сітуацый, то тут удзельная вага аматараў выпіць падскоквае ледзь не да паловы. СТАР. 13

«БЕЛАРУСЫ — НАРОД З ПРЫГОЖАЙ ДУШОЙ»

Сучасная традыцыя

Цырымонію ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне» Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў як адну з галоўных падзей года, якая трывала ўвайшла ў наша жыццё як сучасная традыцыя, што звязвае мінулае і сучаснасць роднай зямлі, напаўняе асаблівым сэнсам нашы мэты і памкненні.

Але галоўнае, па словах Прэзідэнта, што з года ў год такія сустрэчы аб'ядноўваюць нас у самых лепшых і шчырых пачуццях: гонару за дастойных людзей, удзячнасці за міласэрнасць і дабрыню, мужнасць і гераізм, пакланення перад творчасцю і талентам нашых суайчыннікаў.

«Мы, беларусы, народ з прыгожай душой. Я думаю пра гэта кожны раз, калі вывучаю гісторыі поспеху і падпісваю дакументы аб узнагароджанні, — сказаў кіраўнік краіны. — ***За кожным прафесійным або асабістым дасягненнем стаяць у першую чаргу працавітыя і сумленныя людзі. Людзі, якія аддаюць сябе без астатку сваёй місіі, жывуць і працуюць на карысць роднай краіне і народу. Гэта і ёсць патрыятызм».***

Патрыятызм — і ў любові да дзяцей і бескарыслівым імкненні акружыць клопатам тых, каго лёс пазбавіў матчынай ласкі, у самаадданай барацьбе за жыццё і здароўе людзей, у беражлівым стаўленні да культурных здабыткаў нацыі, нашых спрадвечных традыцый і духоўных каштоўнасцяў, у абароне гістарычнай праўды, памяці герояў нашай зямлі, інфармацыйнага суверэнітэту краіны, у выхаванні маладых беларусаў у любові да сваёй краіны і ў духу гонару за сваіх продкаў, падкрэсліў Прэзідэнт.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Чэмпіянат — не пра палітыку

Патрыятызм, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, — і ў спартыўных перамогах на славу Беларусі. І тут ён зрабіў адступленне на злобу дня пра перагаворы з Міжнароднай федэрацыяй хакея.

«Не паспелі яны закончыцца, як нашы ўцекачы абрынуліся на найлепшых нашых замежных сяброў, якія пастаянна падтрымлівалі і падтрымліваюць нас, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — ***Я хачу сказаць, што мы гатовы да правядзення любых міжнародных, у тым ліку і культурных, і спартыўных, спаборніцтваў».***

Права на правядзенне чэмпіянату свету па хакею, як дадаў Аляксандр Лукашэнка, Беларусь выйграла ў сумленнай барацьбе і гатова арганізаваць яго хоць заўтра.

«Для гэтага яшчэ нямала прыйдзецца зрабіць і, на жаль, прыйдзецца даказваць, што мы завёмся людзьмі і ў нас ёсць свая краіна. Мы гатовы размаўляць з любымі шчырымі людзьмі. У тым ліку і з апазіцыяй, але не са здраднікамі. Мы гатовы весці дыялог з любой апазіцыяй, вы гэта бачылі і ведаеце, па любых пытаннях, пачынаючы ад канстытуцыйных змяненняў і заканчваючы будучыняй нашай Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуўся да тых, хто яшчэ мае жаданне «перавярнуць краіну», і заявіў: «Нічога не атрымаецца».

Прэзідэнт сказаў, што ў перагаворах з Рэнэ Фазелем яны разам прыйшлі да адзінага меркавання: спорт павінен аб'ядноўваць, а не наадварот.

«Калі яны (прадстаўнікі МФК. — **«Зв.»**) вытрымаюць ціск з боку сваіх жа палітыкаў, мы правядзём прыгожае спартыўнае свята ў нашай краіне. Можам і без Латвіі, калі яны гэтага не хочуць. ***Упэўнены, што наша Беларусь, прыгожая, гасцінная і бяспечная, — найлепшае месца, якое можна знайсці для ажыццяўлення ідэй алімпізму і культурных ідэй»,*** — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Ён яшчэ раз нагадаў, што ўлады гатовыя весці дыялог з любымі сіламі, якія будуць працаваць на тое, каб краіна станавілася лепшай. Прэзідэнт падкрэсліў, што ўладу нельга ўзяць, грунтуючыся на разбурэнні. «Беларусы не будуць трываць адкочвання назад, разбурэння, а потым, як нам абяцаюць, «мы ўсё гэта пераадолеем і станем заможнымі і багатымі». Так нідзе не было і не будзе. Суседнія прыклады кажуць пра адваротнае», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прыклады самаадданага служэння

Кіраўнік краіны назваў лаўрэатаў прэмій гонарам нацыі: ***«Менавіта такія людзі, як вы, пішуць гісторыю. Такія добрыя справы і пачынанні, як вашы, застаюцца ў памяці народа. Даюць будучым пакаленням маральны і духоўны арыенцір. Вядуць да новых высокіх мэт. І летапіс жыцця беларусаў працягваецца».***

На яго думку, сёння, калі свет становіцца ўсё больш агрэсіўным, асабліва важна цвёрда стаяць на сваёй зямлі, памятаць, што тут стагоддзямі жыў беларускі народ і будзе жыць, усведамляць сябе адзіным цэлым з пакаленнямі розных эпох, разумець, што ў нас ёсць свой шлях, які пачыналі вялікія людзі.

Паводле слоў Прэзідэнта, найлепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў — дабрыня і спачуванне, працавітасць і мэтанакіраванасць, адвага і самаадданасць, наватарства і геніяльнасць — ёсць у кожным з нас.

«Менавіта такім, сапраўдным героем Беларусі, шчырым і адкрытым быў наш Уладыка Філарэт, якога мы, на жаль, страцілі. Ён стаяў каля вытокаў нашага сённяшняга свята, асабіста падтрымліваючы ўсіх лаўрэатаў сваім бласлаўленнем. ***У гісторыі Беларусі Філарэт назаўсёды застанецца прыкладам самаадданага служэння хрысціянскім каштоўнасцям, якія нас аб'ядноўваюць»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Наша агульная мэта, як адзначыў кіраўнік краіны, — быць годнымі нашчадкамі Уладыкі Філарэта і іншых вялікіх дзеячаў тысячагадовай гісторыі роднай зямлі, захаваць повязь часоў і эпох, якая стане апорай для новых пакаленняў.

Прэзідэнт пажадаў, каб узноўлены Тураўскі крыж, як і адроджаны раней крыж Ефрасінні Полацкай, абаранялі нас на гэтым шляху.

«Сімвалічна, што сёння два крыжы побач на сцэне Палаца Рэспублікі. Я з асаблівым пачуццём гонару і падзякі ўручаю прэмію аўтарам узноўленай нацыянальнай святыні. А таксама іншым нашым суайчыннікам, якія сваімі добрымі і шчырымі справамі сапраўды азараюць наша жыццё святлом беларускай душы», — сказаў кіраўнік краіны.

***

Пасля ўручэння ўзнагарод Прэзідэнт зноў звярнуўся да прысутных і пажадаў ім не траціць жыццё на пустаслоўе, непатрэбныя справы і тым больш на разбурэнне.

«Не дай Бог нам у запале гэтага сусветнага вар'яцтва страціць тое, што больш ніколі не вернем, страцім беззваротна, знішчыць уласнымі рукамі тое, што зрабілі за апошнюю чвэрць стагоддзя. Мы ж з вамі гэта зрабілі. Нельга гэта страціць. Чытайце, думайце, аналізуйце і толькі потым рабіце высновы. Мы ж пра сябе кажам, што мы мудрыя і таленавітыя», — дадаў Прэзідэнт.

Гавораць лаўрэаты

Сяргей ПЯРВІЦКІ, галоўны архітэктар праектаў адкрытага акцыянернага таварыства па комплексным праектаванні аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага назначэння «Інстытут Гомельдзяржграндпраект». Лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» стаў у складзе аўтарскага калектыву за стварэнне мемарыяла «Ала» на месцы знішчанай фашыстамі вёскі ў Светлагорскім раёне:

— Менавіта з Алой мяне асабіста нічога не звязвае. Але маю сям'ю, як і многіх беларусаў, кранула вайна — абодва дзяды прайшлі вайну, мама была ў акупацыі ў падобнай вёсцы. Я думаю, у нашай краіне няма чалавека, у якога нічога не было б звязана з вайной...

Наш інстытут у асноўным займаецца сацыяльнымі аб'ектамі, жыллём у Гомелі, таму стварэнне мемарыяла стала для нас своеасаблівай удачай. Мемарыял ствараўся з нуля, і для мяне гэта першы вопыт маштабнай і гістарычна значнай работы. У 2019-м мы стварылі памятны знак братам Лізюковым — тром братам-беларусам, якія загінулі ў час вайны. Але ўсё ж мемарыял — гэта больш складаны і адказны праект. Я вынікам нашай работы задаволены, хоць заўсёды хочацца лепш. Самае галоўнае прызнанне — людзі едуць у Алу, мемарыял запатрабаваны і людзі яго прынялі.

Аляксандр АНІСІМАЎ, галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь, народны артыст Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2020 года. Узнагароду ён атрымаў за значны ўклад ва ўмацаванне міру і згоды ў грамадстве праз музыку, за рэалізацыю буйных рэспубліканскіх і міжнародных творчых праектаў:

— Для мяне зала Палаца Рэспублікі і гэтая сцэна звязаныя з сур'ёзнымі і вельмі цікавымі ўспамінамі. У складзе філарманічнага аркестра мы правялі тут мноства сур'ёзных акцый і ўрачыстых мерапрыемстваў. Тут былі рэалізаваныя шматлікія мастацкія мерапрыемствы. Напрыклад, у 2004 годзе да Дня горада Мінска мы рэалізавалі грандыёзны праект з удзелам шасці аркестраў і чатырох хораў. І мелі тады вялікі поспех у публікі.

Сёння я ўпершыню знаходжуся тут для атрымання ўзнагароды. Вядома, гэта вельмі радасная падзея і я вельмі гэтым ганаруся.

«У ГЭТЫМ СТАРТАВЫМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ ТРЭБА АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ ЗВЯРНУЦЬ НА ЯКАСЦЬ»

З такім пасылам да вытворцаў звярнуўся Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Юрыем Назаравым і міністрам прамысловасці Пятром Пархомчыкам.

Па словах кіраўніка краіны, без павышэння якасці прадукцыі нічога ў галіне зрабіць не атрымаецца: «У гэтым стартавым годзе пяцігодкі трэба асаблівую ўвагу звярнуць на якасць».

Прэзідэнт папрасіў далажыць пра работу Мінпрама за мінулы год у асноўных рысах. Але адзначыў, што неабходна пахваліць найлепшых і «паставіць на месца» тых, хто спрацаваў дрэнна.

Пацікавіўся лідар краіны планамі галіны на будучыню. ***«Менавіта планы. Не нейкія прагнозы. Гэтую балбатню, так званую рыначную, неабходна заканчваць. Ёсць жорсткі план, і, калі мы хочам выжыць, мы павінны гэтыя планы рэалізоўваць.*** Хай нас крытыкуюць, што мы рэтраграды, кансерватары і гэтак далей. Але калі прадпрыемствы будуць працаваць і чалавек будзе мець заробак, пажадана вышэйшы, чым у мінулым годзе, тады нас ацэняць», — сказаў Прэзідэнт.

Таксама сярод важных пытанняў, на якія ён звярнуў увагу, — раўнамерныя пастаўкі тэхнікі па кварталах і арганізацыя работы па лізінгу па Указе № 136.

Даведка. Згодна са зменамі, што адбыліся летам 2020 года, закупка тэхнікі прадпрыемствамі, пералічанымі ва Указе № 146, можа ажыццяўляцца за кошт крэдытаў, што выдаюцца на рыначных умовах Банкам развіцця Рэспублікі Беларусь і іншымі банкамі лізінгавым кампаніям, якія маюць уласны капітал не менш за 100 млн рублёў (раней ва Указе згадвалася толькі кампанія «Прамагралізінг») з наступным субсідзіраваннем лізінгаатрымальнікам часткі плацяжоў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў пра сфарміраваны на пяцігодку план заказаў вытворчасці беларускай тэхнікі, закупак і продажу. Пацікавіўся Прэзідэнт допускам айчынных прадпрыемстваў да дзяржаўных закупак у Расіі.

«Для мяне гэта прынцыпова. Я хачу некалькі прынцыповых пытанняў сфармуляваць для кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, каб мы маглі на чарговай сустрэчы ва ўрадзе і на ўзроўні прэзідэнтаў абмеркаваць, як выконваюцца рашэнні двух прэзідэнтаў, якіх мы дасягнулі ў Сочы па кааперацыі і па продажах», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Яшчэ адно пытанне, якое было закранута на сустрэчы, — санкцыі Захаду адносна некаторых прадпрыемстваў. Такія меры кіраўнік краіны назваў «бандыцкімі» і паставіў задачу ўраду: «Перадайце Галоўчанку (прэм'ер-міністру. — **«Зв».**) і вырашыце гэтае пытанне ва ўрадзе. Мы павінны не асіметрычна, а сіметрычна адказаць на гэта. Яны ўвялі супраць нашых прадпрыемстваў санкцыі — мы павінны паглядзець, якія краіны гэта зрабілі, і адпаведным чынам адрэагаваць».

Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі працуе амаль тры тысячы замежных прадпрыемстваў розных памераў. «Яны павінны разумець: у нас добра з імі — добра гэтым прадпрыемствам. Калі яны (краіны, што ўвялі санкцыі. — **«Зв.»**) зрабілі крокі ў няправільным кірунку і пачынаюць нас нахіляць — мы павінны сіметрычна адказаць. Не трэба баяцца — трэба ім паказваць зубы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Спыніўся Прэзідэнт і на праблеме інвестыцыйных праектаў у папяровай вытворчасці ў Шклове, Добрушы, Светлагорску. Размова вялася і пра планы «Гродна Азота». «Гэта будзе асноўнае прадпрыемства на пяцігодку («Гродна Азот». — **«Зв.»**), калі мы пабудуем, — паведаміў Прэзідэнт. — Канешне, пяць гадоў мы яго будаваць не будзем, але тым не менш неабходна сучаснае прадпрыемства па вытворчасці азотных угнаенняў пабудаваць. Таму што сёння ёсць і будзе попыт, бо не хапае харчавання ў свеце».

Віцэ-прэм'ер Юрый Назараў пачаў даклад з інфармацыі, што аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў 2020 годзе на 0,7 % не дацягнулі да ўзроўню 2019 года. Толькі «Белеспаперапрам» перавысіў паказчыкі. «Я хацеў падкрэсліць, што гэта ведамства, якое працуе на мясцовай сыравіне. Вы заўсёды казалі, што незалежна ад нафты, газу, дамоўленасцяў — ёсць свая сыравіна, пускай яе ў перапрацоўку, атрымлівай якасны прадукт, экспартуй, прадавай», — звярнуўся да Прэзідэнта віцэ-прэм'ер.

«Нашым пратэстунам і тым, хто нас крытыкаваў, трэба сказаць, што ў гэтым годзе сельская гаспадарка выратавала нас, дадала пяць працэнтаў у складаны год, і экспарт пойдзе. Як і дрэваапрацоўка — «куды, грошы не туды ўкладваем... (крытыкавалі. — **«Зв».**)» Яна сёння нас выратоўвае і дае вынік. Мы тут перапрацоўваем мясцовую сыравіну і па вытворчасці, і па экспарце дадалі. Там, куды мы ўкладліся і аддалі асаблівую ўвагу — атрымалі аддачу», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Як расказаў журналістам міністр прамысловасці Пётр Пархомчык, па выніках размовы з Прэзідэнтам была пастаўлена задача закласці з першага квартала станоўчую дынаміку па пытаннях аб'ёму вытворчасці, пры гэтым не перавышаць запас на складах за кошт экспарту і яго дыверсіфікацыі.

Назваў Пётр Пархомчык і выніковыя паказчыкі работы за мінулы год. «Па выніках года адносна першага паўгоддзя мы скарацілі запасы на складах на 303 мільёны рублёў», — канстатаваў міністр.

Наконт санкцый Захаду канкрэтныя рашэнні пакуль не прымаліся, дадаў ён, але яшчэ раз актуалізаваліся пытанні імпартазамяшчэння. «Тыя пытанні, што ўзніклі па асобных прадпрыемствах Міністэрства прамысловасці, паказваюць, што асноўныя кампаненты і вузлы сёння ствараюцца ў Еўропе ці іншых краінах. Таму Прэзідэнт паставіў задачу, што дадзеныя кампетэнцыі павінны развівацца ў Рэспубліцы Беларусь»,— паведаміў Пётр Пархомчык.

Ён расказаў, што асаблівую ўвагу падчас сустрэчы аддалі якасці прадукцыі.

Блізкая ўлада

НА СУВЯЗІ!

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА правядзе прамую тэлефонную лінію, якая адбудзецца **14 студзеня,** паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі. Патэлефанаваць і задаць пытанне, якое хвалюе, спікеру верхняй палаты парламента можна па тэлефоне 8 (017) **328-53-24** з **15.00** да **18.00.**

Фінансы

ЁСЦЬ ЗАПАС!

Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка краіны, залаты запас Беларусі за 2020 год вырас на 1 тону і, па даных на 1 студзеня гэтага года, складае 43,2 тоны (залатога эквіваленту).

Варта адзначыць, што на пачатак мінулага года гэты паказчык складаў 42,2 тоны, а на 1 студзеня 2019-га — 41,2 тоны. У прэс-службе Нацбанка адзначаюць, што наяўнасць залатога запасу падтрымлівае давер рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў да здольнасці Нацыянальнага банка і ўрада выконваць свае фінансавыя абавязацельствы і праводзіць манетарную палітыку. Таксама каштоўныя металы могуць быць выкарыстаны ў выпадку неабходнасці шляхам іх продажу, абмену альбо выкарыстання ў разліках.

Залаты запас — гэта каштоўныя металы ў выглядзе банкаўскіх зліткаў, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Нацыянальнага банка і з'яўляюцца часткай Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Беларусі.

Сяргей КУРКАЧ.

НАРОДУ БЕЛАРУСІ

Сёння мы ўсе смуткуем. Не стала ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Мітрапаліта Філарэта, чалавека бязмежнай веры і мудрасці.

Нам пашанцавала, што большую частку свайго жыцця ён аддаў беларускай зямлі, якую палюбіў усёй душой.

Мітрапаліта Філарэта нездарма называлі меркай маральнасці і сумленнем нацыі. Яго архіпастырскае служэнне ў Беларусі супала з эпохай станаўлення незалежнай дзяржавы. Дзякуючы падтрымцы і бацькоўскім парадам Уладыкі мы разам пабудавалі моцную суверэнную краіну, дзе ўсе жывуць у міры, згодзе і няма месца рэлігійнай варожасці. Наша шматгадовая дружба і велізарная ўзаемная павага сталі для мяне магутнай духоўнай апорай.

Мы страцілі Героя Беларусі, настаўніка і самага шчырага абаронцу, які да апошняга свайго часу маліўся за дабрабыт гэтай краіны і яе народа.

Светлая памяць пра Мітрапаліта Філарэта назаўжды застанецца ў нашых сэрцах і летапісе Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Слова — удзельнікам

«Купляць варта тэхналогіі, а не прадукцыю»

Генрых МЫСЛІВЕЦ вядомы на Гродзеншчыне і як старажыл аграбізнесу, і як актыўны грамадскі дзеяч. Ён неаднаразова быў дэпутатам раённага і абласнога Саветаў. Вылучэнне яго кандыдатуры на VI Усебеларускі сход зацверджана рашэннем сесіі Мастоўскага раённага Савета дэпутатаў.

grodnonews.by

Як сапраўдны гаспадар, Генрых Валяр'янавіч да кожнай справы ставіцца сур'ёзна. Ёсць у яго і свае меркаванні наконт далейшага развіцця эканомікі краіны. Між іншым, гэтыя думкі ён выказваў неаднойчы. Вось і ў нядаўняй нашай размове ён падкрэсліў, што галоўнае зараз — звярнуць асаблівую ўвагу на рэальны сектар эканомікі, у прыватнасці на сельскую гаспадарку.

Сам Генрых Мыслівец удала развівае той кірунак, за які ўзяўся. Па вырошчванні гародніны фермерская гаспадарка «Гарызонт» з'яўляецца самай буйной ва ўсім Гродзенскім рэгіёне. Цяпер у Генрыха Мысліўца 720 гектараў ворыва. Старажыл аграбізнесу забяспечвае ўвесь Мастоўскі раён гароднінай.

Як вопытны вытворца, а фермер вырошчвае амаль увесь валавы збор агародніны раёна (98 %) і трэцюю частку бульбы (31 %), ён пастаянна паглыбляе сваю дзейнасць. У гаспадарцы не толькі вырошчваюць, але і займаюцца перапрацоўкай агародніны. Таварная прадукцыя, у тым ліку бульба, морква, буракі, капуста, цыбуля, праходзіць праз лінію ўпакоўкі і адпраўляецца на рэалізацыю — ад мясцовых супермаркетаў да замежных спажыўцоў.

Як прадстаўнік сельскагаспадарчай вытворчасці, Генрых Валяр'янавіч у першую чаргу дбае пра гэты важны сектар эканомікі. На думку кіраўніка фермерскай гаспадаркі, толькі свае, беларускія, інвестары здольныя вывесці сельскую гаспадарку на новы ўзровень.

І ў гэтым паказальны яго вопыт. Бо свой шлях фермер пачынаў на дзесяці гектарах, але паступова даказаў, што здольны працаваць рэнтабельна і якасна. Яго гаспадарка — прыклад вялікіх магчымасцяў і здольнасцяў беларускіх аграрыяў. Мыслівец расказаў, што ў яго ёсць сучасная тэхніка, аўтарэфрыжэратары, лініі расфасоўкі і ўпакоўкі гародніны. Не так даўно тут пачалі займацца выпускам паўфабрыкатаў у вакуумнай упакоўцы. Робяць салаты, квасяць капусту. Прадукцыю развозяць як па раёне, так і па вобласці. Нядаўна ў вёсцы Пладовая адкрылі сваю краму. У планах — наладзіць замарозку гародніны. Шматрофільнасць характэрная для аграхолдынгаў, а вось малыя гаспадаркі павінны мець вузкую спецыялізацыю.

— Адзін павінен вырошчваць, другі — перапрацоўваць, хтосьці — прадаваць, — лічыць Генрых Валяр'янавіч. — Кожны займаецца сваёй справай і ўдасканальвае яе. Але для гэтага патрэбны адпаведныя вытворцы, якія ішлі б у аграбізнес, прычым нашы, беларускія.

Магчымасці для гэтага ёсць. Для закупкі тэхнікі існуюць лізінгавыя праграмы. Але варта зацікавіць менавіта сваіх інвестараў, якія выраслі на гэтай зямлі. Яго як вытворцу і дэпутата клапоціць стан айчыннага рынку.

— Сёння рынак адкрыты для ўсіх. І часта прыходзяць не толькі праверaныя вытворцы, але і фірмы-аднадзёнкі, якія прагнуць атрымаць імгненны звышпрыбытак, — адзначае фермер. — Таму вельмі важна абараніць айчынных вытворцаў, якія працуюць на якасць. Каб яны мелі доўгатэрміновыя кантракты і сістэму дагавораў. Інакш кажучы, стабільныя ўмовы работы.

Менавіта гэта варта абмеркаваць на чарговым Усебеларускім сходзе, лічыць фермер. На яго думку, сёння вельмі актуальнае пытанне фінансавай дапамогі сельгасвытворцам. У першую чаргу — крэдытамі. Каб можна было вясной набыць тыя ж самыя ўгнаенні, насенне, тэхніку. Увосень гэтыя сродкі вернуцца і добрымі ўраджаямі, і кармамі, і — адпаведна — надоямі. Усе будуць у выйгрышы. Бо крэдыты вернуцца ў бюджэт з працэнтамі, вытворцы атрымаюць добры асабісты даход, павысіцца іх пакупніцкая здольнасць. Вельмі важна падтрымаць рэальны сектар эканомікі і даць магчымасць беларусам самім займацца вытворчасцю, а не траціць валюту на закупку замежнага тавару. Купляць трэба тэхналогіі, лічыць фермер. А тавары беларусы ў стане і самі выпускаць у сваёй краіне.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ЯГО МАЛІТВА ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ ГУЧАЦЬ У БЕЛАРУСКІХ ХРАМАХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Філарэт... У грэчаскай мове гэтае імя азначае — «той, хто любіць дабрадзейнасць». Прыгожае імя для прыгожай душы... Для беларусаў менавіта так успрымалася імя Патрыяршага Экзарха усяе Беларусі Філарэта, чыё свецкае імя — Кірыла Варфаламеевіч Вахрамееў.

Калі чуеш вестку пра смерць чалавека глыбока веруючага, уцаркоўленага, боль ад страты змякчаецца тымі словамі веры, хрысціянскім стаўленнем да сыходу са свету зямнога, якія ты ўспрымаў ад гэтага чалавека. «Смерць! Дзе тваё джала? пекла! дзе твая перамога?.. Але падзяка Богу, Які даў нам перамогу Госпадам нашым Ісусам Хрыстом!» Словы з пасланння Апостала Паўла абавязкова гучаць на Вялікдзень, і шмат разоў мы чулі іх з вуснаў Уладыкі Філарэта, і сёння ўспомнім іх, гаруючы з нагоды ягонай смерці.

Чалавек мудры і тонкі, ён сябраваў з многімі прадстаўнікамі беларускай культуры — дарэчы, сам добра разбіраўся ў мастацтве. Нашчадак старажытнага купецкага роду, сын выкладчыкаў музыкі, меў музычную адукацыю, але абраў шлях манаха і святара. Пры гэтым яму было цікава і ўсё тое, што ствараецца ў свецкай духоўнай прасторы — бо духоўнасць, агульная, грамадская, вырастае з маленькага зернетка, прабіваецца і там, дзе, здавалася б, усё вельмі матэрыяльна, груба... Добры пастыр, пра якога кажа Біблія, даражыць усімі падапечнымі аднолькава і не пакідае іх ніколі. І ў сыходзе Уладыка Філарэт застаўся разам са сваім народам, падзяліўшы з ім страшную навалу пандэміі. Недарэмна прыхаджане часам любоўна называлі яго ў прыватных гутарках «уладычанька» — як свайго, блізкага чалавека, мудрага настаўніка, які зразумее, усміхнецца, падтрымае...

Калі заходзіш у стары храм, мімаволі думаеш пра ўсіх тых, хто да цябе тут маліўся, напаўняў яго сваімі думкамі, скіраванымі да неба, умацоўваў верай... Можна ўявіць, што яны і цяпер тут прысутнічаюць, моляцца разам з табою, за цябе. За час свайго служэння — а Уладыка Філарэт яшчэ ў 1978-м быў прызначаны мітрапалітам Мінскім і Беларускім — ён пабываў шмат у якіх беларускіх храмах, і не толькі дзеля службы. Клапаціўся і пра захаванасць помнікаў беларускай храмавай архітэктуры, пра аднаўленне старажытных храмаў і духоўных кніг. І цяпер у гэтых храмах заўсёды будзе адчувацца ягоная нябачная прысутнасць, як яшчэ аднаго ахоўніка нябеснага.

Уладыка сышоў на другім тыдні пасля Раства Хрыстова, у час святочны... Ды яшчэ якраз на Беларусі, якой ён шчыра аддаў столькі сіл сваёй душы, пачалася сапраўдная зіма — пяшчотны снег ахутаў чорныя дрэвы і кустоўе, ператварыўшы іх у гожыя дэкарацыі для каляднага святкавання. Пейзажы замілоўваюць, абуджаюць у памяці песнапенні, якімі сустракаюць Раство... Чысты белы покрыў на нейкі час ахінуў учарнелую ад бяды беларускую зямлю. Па гэтым белым покрыве ідзе да нас не толькі боль ад страт, але і надзея. І колькі б ні змяняўся пейзаж, людскія настроі, абставіны жыцця грамадства, светлая памяць пра Уладыку Філарэта застанецца пад гэтым небам, у нашых храмах, у нашых сэрцах.

Звяздоўцы.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сусветныя цэны на прадукты харчавання летась аказаліся найвышэйшымі за тры гады

Пра гэта паведаміла Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (FAO) на падставе даных спецыяльнага індэкса, які адлюстроўвае памесячныя змены міжнародных цэн на асноўныя віды прадуктаў харчавання. У FAO не схільныя звязваць рост выключна з пандэміяй каранавіруса, якая прывяла да некаторых перабояў і затрымак у пастаўках. Між тым у красавіку мінулага года Сусветная харчовая праграма ААН апублікавала штогадовы даклад, у якім папярэдзіла аб магчымасці «біблейскага» голаду з-за пандэміі. Па звестках ААН, колькасць маючых вострую патрэбу ў забеспячэнні харчаваннем у свеце можа вырасці са 130 да 265 мільёнаў чалавек. А міжнародная дабрачынная арганізацыя Oxfam пазней выказала здагадку, што смяротнасць ад голаду перавысіць смяротнасць ад COVID-19. Асабліва гэта датычыцца насельніцтва Емена, Конга, Афганістана, Венесуэлы, Сахеля (Буркіна-Фасо), Эфіопіі, Судана, Сірыі і Гаіці.

Кім Чэн Ын стаў генсекам Працоўнай партыі КНДР

Паўночнакарэйскі лідар, які дагэтуль быў старшынёй Працоўнай партыі, стаў яе генеральным сакратаром, паведаміла ЦТАК. Абранне Кім Чэн Ына адбылося на шасцідзённай сесіі восьмага з'езда партыі ў Пхеньяне.

Агенцтва Yonhap паведаміла, што паўднёвакарэйскія вайскоўцы заўважылі познім вечарам у Пхеньяне прыкметы правядзення ваеннага параду. Журналісты звязваюць правядзенне параду ў паўночнакарэйскай сталіцы са з'ездам Працоўнай партыі. Тытул генеральнага сакратара раней насіў бацька Кім Чэн Ына — Кім Чэн Ір, а яшчэ раней — заснавальнік КНДР Кім Ір Сен. Yonhap звярнула ўвагу, што Кім Ё Чжон — сястра Кім Чэн Ына — не ўвайшла ў склад новага Палітбюро ЦК ТПК, захаваўшы за сабой пасаду члена Цэнтральнага камітэта.

У Беніне прайшоў фэст вуду

Штогадовы фестываль вуду — адзін з самых экзатычных у свеце —- прайшоў у Беніне без звычайнага размаху з-за пандэміі каранавіруса, паведаміў Euronews. Але традыцыйныя рытуалы і фальклорныя шоу, хай і не такія шматлікія, усё ж адбыліся. Насуперак меркаванню, вуду — не культ чорнай магіі, а складаная філасофская сістэма з афрыканскімі каранямі. Месцам яе зараджэння лічыцца горад Уіда ў Беніне, які стагоддзямі быў галоўным пунктам адпраўкі чарнаскурых рабоў. Сюды звычайна з'язджаюцца жрацы вуду з іншых афрыканскіх краін, тут жа адкрываецца імправізаваны рынак рытуальных прадметаў і амулетаў. Кажуць, што ў лістападзе 2019-га аракул вуду То Фа прадказаў «сур'ёзную хваробу на будучы год».

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь смуткуе з нагоды смерці былога начальніка ўпраўлення міністэрства КАМОСКІ Ірыны Віктараўны і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы. Светлая памяць.

МУЛЬТЫПЛІКАТЫЎНЫ ЭФЕКТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Руслан Барысавіч, якія ёсць асаблівасці ў структуры валавога рэгіянальнага прадукту Магілёўскай вобласці? За кошт якіх складнікаў адбыўся рост агульнага паказчыка?

— Прынцыповых асаблівасцяў у яго структуры няма, усё прыблізна аднолькава. Толькі Мінск адрозніваецца тым, што ў яго адсутнічае сельская галіна. У структуры ВРП Магілёўскай вобласці каля 13 % займае сельская гаспадарка, 35 % — прамысловасць, каля 9 % — гандаль, 6 % — транспартная дзейнасць, 5,5 % — будаўніцтва, усе астатнія — менш. Нягледзячы на складанасці і асаблівасці года, усе асноўныя галіны рэальнага сектара эканомікі падраслі.

Сельская гаспадарка стала драйверам эканомікі ўсёй Магілёўскай вобласці, ды і краіны ў цэлым. Тэмп росту валавой прадукцыі гаспадарак усіх катэгорый склаў 105,3 %. Гэтаму спрыяў цэлы комплекс мерапрыемстваў, як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. Істотна палепшылі работу на зямлі шляхам перагляду структуры пасяўных плошчаў і выканання тэхналагічных рэгламентаў па кожнай культуры. Гэта і тэрміны ўнясення ўгнаенняў, іх колькасць, падбор глебы. Леанід Канстанцінавіч (Заяц — старшыня аблвыканкама. — **Рэд.**) асабіста аддаваў гэтаму шмат увагі. У выніку валавы збор збожжавых і зернебабовых культур у свірнавой вазе па Магілёўскай вобласці склаў мільён дзвесце сямнаццаць тысяч тон — 140 % у параўнанні з мінулым годам. Плённая работа ў раслінаводстве адбілася на жывёлагадоўлі. Рапсу, напрыклад, сабралі амаль у паўтара раза больш, чым пазалетась. Усё гэта дазволіла стварыць трывалую кармавую базу для жывёл. Рэалізацыя малака ў выніку павялічылася на 8 %.

— У той час як увесь свет перайшоў на дыстанцыйную форму адносін, у краіне і ў тым ліку Магілёўскай вобласці працягвалі працаваць прадпрыемствы і арганізацыі. Што гэта дало?

— Адбыўся мультыплікатыўны эфект ад сельскай гаспадаркі, бо з ёй звязана перапрацоўчая галіна. Так «Бабушкіна крынка» дзякуючы глыбіні перапрацоўкі павялічыла тэмп назапашвання аб'ёму вытворчасці да 113 %, «Малочныя горкі» — да 109 %, Магілёўскі і Бабруйскі мясакамбінаты — да 103,5 % і 101,5 % адпаведна. У цэлым прамысловы комплекс спрацаваў з тэмпам росту 102,6 %. Гэта таксама найлепшы паказчык па краіне. Істотны рост паказалі прыватныя кампаніі, якія забяспечылі тэмп росту прамысловай вытворчасці за 11 месяцаў у памеры 110 %. Гэта сведчыць, што нават у цяжкіх умовах можна нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, а сусветны крызіс разглядаць як магчымасць для заваявання новых рынкаў. Яркім прыкладам з'яўляецца кампанія «БелЭмса», якая за кошт устаноўкі аўтаматычных ліній па вытворчасці медыцынскіх масак і расшырэння лінейкі вытворчасці сродкаў гігіены і медыцынскага прызначэння павялічыла аб'ём рэалізацыі сваёй прадукцыі больш чым у пяць разоў. Добры прырост

паказалі асіповіцкі завод «Тэхналіколь», магілёўскія вытворцы «Сервалюкс Агра» і «Джакей Пластык», навукова-вытворчае прадпрыемства «Тэхналіт», дрэваапрацовачныя кампаніі СЭЗ «Магілёў» — «ВМГ Індустры», «Кранаспан», «Мебелайн». Пасля першай хвалі каранавіруса рэзка павялічыўся асабліва ў інтэрнэт-гандлі попыт на мэблю. Нашы вытворцы адваявалі частку рынку ў іншых кампаній, таму што працягвалі працаваць у той час, калі тыя прыпыніліся. Рэспубліканскія прадпрыемствы крыху не дацягнулі да 100 %, але тут таксама ёсць лідары. Нарасцілі вытворчасць «Бабруйскаграмаш», Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў, магілёўская «Ольса», Касцюковіцкі і Крычаўскі цэментныя заводы, Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод. Гэта яшчэ раз пацвярджае правільнасць той стратэгіі, якую абраў прамысловы комплекс Рэспублікі Беларусь.

— Прадукцыя рэалізоўвалася ўнутры краіны?

— Не толькі. Напрыклад, вырабы кампаніі «БелЭмса» былі запатрабаваныя ў Сербіі, Харватыі, Ізраілі, Турцыі, Расіі, ва Украіне. Некаторыя рэзідэнты СЭЗ наогул толькі на экспарт і працуюць. Дарэчы, атрымалася не толькі нарасціць вытворчасць, але і знізіць складскія запасы па ўсёй вобласці. На 1 снежня мінулага года іх было на суму 407,8 мільёна рублёў, што менш за месячную вытворчасць. На працягу года іх аб'ёмы зменшыліся на 18 мільёнаў рублёў.

— Летась у вобласці ўводзілася ў строй шмат розных аб'ектаў, чаго не было, напэўна, нават у самыя спрыяльныя для эканомікі гады...

— Так. Будаўнічы комплекс спрацаваў з вынікам 103 %. За 11 месяцаў уведзена ў эксплуатацыю 276 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку 103 тысячы квадратных метраў з падтрымкай дзяржавы. Жыллёвыя ўмовы палепшылі 1140 шматдзетных сем'яў. Пабудавана доўгачаканая па ліклініка ў Казіміраўцы, рэканструяваны лячэбны корпус дзіцячай бальніцы ў Бабруйску, капітальна адрамантаваныя паліклінікі ў Мсціславе і Асіповічах, пабудаваныя дзіцячыя садкі ў Слаўгарадзе, Бабруйску, Шклоўскім раёне — усяго ўведзена ў строй 17 значных аб'ектаў сацыяльнага і культурнага прызначэння.

— Каб эканоміка працавала, яе трэба «падсілкоўваць». А гэта мадэрнізацыя, навукаёмістыя тэхналогіі, інвестыцыі...

— Без гэтага, сапраўды, нельга абысціся, і дадзены працэс не прыпыняўся. Магілёўскае прадпрыемства «Магатэкс» завяршае рэалізацыю інавацыйнага праекта па падрыхтоўцы вытворчасці па выпуску тканіны новых спажывецкіх якасцяў. Шклоўскі завод газетнай паперы завяршыў мадэрнізацыю і асвоіў вытворчасць паперы-асновы для дэкаратыўных абліцовачных матэрыялаў. Асаблівая ўвага аддаецца развіццю паўднёва-ўсходняга рэгіёна. У мінулым годзе былі ўнесены змяненні ва Указ № 235 і ўведзены дадатковыя льготы і прэферэнцыі. Гэта дало магчымасць стварыць прывабныя ўмовы для бізнесу. У Слаўгарадзе рэалізуе інвестыцыйны праект бабруйскае прадпрыемства «Чырвоны харчавік», у Клімавічах навукова-вытворчае прадпрыемства «Тэхналіт» рыхтуе пляцоўку для вырабу экалагічна чыстага вугалю. Праведзена мадэрнізацыя лесагаспадарчых аб'ектаў на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна. У бліжэйшыя гады тут будзе наладжана вялікая работа па развіцці свінагадоўчай галіны, плануецца рэканструкцыя ўжо існуючых і будаўніцтва новых комплексаў. Гэта дазволіць нарасціць пагалоўе свіней і цалкам загрузіць мясакамбінаты вобласці.

— Важны індыкатар паспяхова працуючай эканомікі — павышэнне зарплаты і занятасць насельніцтва. Якія тут адбыліся зрухі?

— У нас атрымалася палепшыць фінансавы стан прадпрыемстваў. Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі па Магілёўскай вобласці склаў 822,8 мільёна рублёў, што ў 1,6 раза вышэй, чым годам раней. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі склала 6,2 % супраць 4,1 % за аналагічны перыяд папярэдняга года. Як вынік, за 11 месяцаў сярэднямесячная зарплата ў цэлым па вобласці склала 1005 рублёў пры тэмпе росту 112,8 %. У лістападзе яна павялічылася ўжо да 1065 рублёў. Планку ў 1000 рублёў у лістападзе пераадолелі не толькі Магілёў і Бабруйск, але яшчэ Бялыніцкі (1019), Магілёўскі (1074,5), Асіповіцкі (1087,6) і Шклоўскі (1045,6) раёны. Сталі не было магчымасці. Між тым прадпрыемства ў такіх складаных умовах здолела захаваць працоўны калектыў, паспяхова нарошчвае аб'ёмы вытворчасці новых відаў прадукцыі і распрацоўвае планы па далейшай мадэрнізацыі прадпрыемства.

На жаль, не ўсе прадпрыемствы змаглі прыстасавацца да новых умоў. Застаецца высокі ўзровень стратных арганізацый — 133 (18,9 % ад агульнай колькасці). Але і тут ёсць зрухі. Па выніках першага квартала іх было 188.

— Ад пандэміі пацярпелі турыстычны і рэстаранны бізнес. Яны, на жаль, па аб'ектыўных прычынах не змаглі зрабіць свой унёсак у агульную справу. Іх саміх прыйшлося падтрымліваць. Якія паказчыкі наогул не атрымалася выканаць?

— На жаль, не дацягнулі па экспарце, хоць на гэта былі аб'ектыўныя прычыны. Адбылася пераарыентацыя на ўнутраны рынак. Спад адбыўся і па некаторых іншых сектарах. Экспарт турыстычных паслуг, напрыклад, знізіўся на 72 %, экспарт будаўнічых і транспартных паслуг — на 6,8 % і 3,7 % адпаведна. На ўзроўні дзяржавы прымаліся асобныя рашэнні па падтрымцы найбольш пацярпеўшых прадстаўнікоў гэтага сектара эканомікі. У некаторых выпадках падтрымка аказвалася канкрэтным работнікам, якія вымушаны былі працаваць у рэжыме няпоўнай занятасці. У перыяд пандэміі аблсаветам дэпутатаў удвая былі зніжаны стаўкі адзінага падатку для прадпрымальнікаў.

— Чаму навучыў мінулы няпросты год?

— Галоўным урокам стала разуменне, што вырашаць праблемы трэба разам, супрацоўнічаючы і дапамагаючы адзін аднаму. Гэты час выпрабаванняў навучыў гатоўнасці прымаць нечаканыя рашэнні. Цяпер мы ведаем, што рабіць, каб дасягаць пастаўленых мэт нават у надзвычайных умовах. Асноўнымі прыярытэтамі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці на гэты год з'яўляюцца сацыяльная стабільнасць і рост дабрабыту насельніцтва. Для гэтага асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваныя на ўмацаванні эканомікі за кошт росту інвестыцый, экспарту, павышэння эфектыўнасці работы рэальнага сектара эканомікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Руслана СТРАХАРА.

Фота БелТА.

«БелЭмса» аператыўна наладзіла выпуск аднаразовых медыцынскіх масак.

Фота mogilevnews.by

Сёлета ў Слаўгарадзе «Чырвоны харчавік» запусціў сучасную лінію па разліве мёду.

більнай застаецца сітуацыя на рынку працы. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя складае 0,3 % да колькасці працоўнай сілы. Гэта адпавядае той жа лічбе, што і ў пачатку 2019 года. Як і раней, прапанова на прадпрыемствах перавышае попыт. У сярэднім на аднаго беспрацоўнага прыходзіцца 5,4 вакансіі.

— За канкрэтнымі справамі стаяць канкрэтныя людзі. Трэба быць прадбачлівым і мудрым кіраўніком, каб у складанай сітуацыі сарыентавацца і выбраць адзіна правільнае рашэнне...

— Так. Вынікі, як правіла, залежаць ад працоўнага калектыву і шмат у чым ад яго кіраўніцтва. Там, дзе была выбрана правільная стратэгія і аптымізаваныя выдаткі, назіраўся станоўчы вынік. Аб'ём прамысловай вытворчасці па Магілёўскай вобласці мог быць вышэйшы, але свае карэктывы ўнёс шэраг аб'ектыўных фактараў. Вось толькі адзін яскравы прыклад. З 2020 года ў краіне прыпыніўся выпуск дызельнага паліва, а ў структуры нашага найбуйнейшага прадпрыемства «Магілёўхімвалакно» выручка ад яго складала да 40 %. Імгненна замясціць чымсьці не было магчымасці. Між тым прадпрыемства ў такіх складаных умовах здолела захаваць працоўны калектыў, паспяхова нарошчвае аб'ёмы вытворчасці новых відаў прадукцыі і распрацоўвае планы па далейшай мадэрнізацыі прадпрыемства.

На жаль, не ўсе прадпрыемствы змаглі прыстасавацца да новых умоў. Застаецца высокі ўзровень стратных арганізацый — 133 (18,9 % ад агульнай колькасці). Але і тут ёсць зрухі. Па выніках першага квартала іх было 188.

— Ад пандэміі пацярпелі турыстычны і рэстаранны бізнес. Яны, на жаль, па аб'ектыўных прычынах не змаглі зрабіць свой унёсак у агульную справу. Іх саміх прыйшлося падтрымліваць. Якія паказчыкі наогул не атрымалася выканаць?

— На жаль, не дацягнулі па экспарце, хоць на гэта былі аб'ектыўныя прычыны. Адбылася пераарыентацыя на ўнутраны рынак. Спад адбыўся і па некаторых іншых сектарах. Экспарт турыстычных паслуг, напрыклад, знізіўся на 72 %, экспарт будаўнічых і транспартных паслуг — на 6,8 % і 3,7 % адпаведна. На ўзроўні дзяржавы прымаліся асобныя рашэнні па падтрымцы найбольш пацярпеўшых прадстаўнікоў гэтага сектара эканомікі. У некаторых выпадках падтрымка аказвалася канкрэтным работнікам, якія вымушаны былі працаваць у рэжыме няпоўнай занятасці. У перыяд пандэміі аблсаветам дэпутатаў удвая былі зніжаны стаўкі адзінага падатку для прадпрымальнікаў.

— Чаму навучыў мінулы няпросты год?

— Галоўным урокам стала разуменне, што вырашаць праблемы трэба разам, супрацоўнічаючы і дапамагаючы адзін аднаму. Гэты час выпрабаванняў навучыў гатоўнасці прымаць нечаканыя рашэнні. Цяпер мы ведаем, што рабіць, каб дасягаць пастаўленых мэт нават у надзвычайных умовах. Асноўнымі прыярытэтамі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці на гэты год з'яўляюцца сацыяльная стабільнасць і рост дабрабыту насельніцтва. Для гэтага асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваныя на ўмацаванні эканомікі за кошт росту інвестыцый, экспарту, павышэння эфектыўнасці работы рэальнага сектара эканомікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Руслана СТРАХАРА.

Дэкларованне даходаў

ПАДЛІЧЫМ СВАЕ «ПЛЮСЫ»

Зрабіць гэта трэба да 1 красавіка. Але лепш не адкладваць да апошняга

Сёлета дэкларацыю аб даходах за мінулы год трэба падаць у тэрмін не пазней за 31 сакавіка. Хто абавязаны займацца падлікам сваіх даходаў, а пры неабходнасці звярнуцца ў падатковы орган? Газета «Звязда» сумесна са спецыялістамі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) падрыхтавала падрабязны тлумачальнік.

ДРУГАЯ ЛЕГКАВУШКА, ГРУЗАВІК І АЎТОБУС

Да пачатку другога месяца вясны абавязкова запоўніць дэкларацыю павінны тыя людзі, хто за мінулы год прадаў больш чым адзін аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога складае да 3500 кілаграмаў і колькасць сядзячых месцаў у якім, акрамя сядзення кіроўцы, — да васьмі. Абавязак на дэклараванне пачынаецца таксама пасля продажу аднаго грузавога аўтамабіля або аўтобуса, калі агульная маса першага перавышае 3500 кілаграмаў або колькасць месцаў другога перавышае восем. Тут спецыялісты МПЗ удакладнілі, што, калі машына, якую вы прадалі, дасталася вам у спадчыну, падатак плаціць не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння транспартных сродкаў на працягу календарнага года.

ЛІЧЫМ КВАТЭРЫ, ГАРАЖЫ І ДОЛІ

Займацца дэкларараннем сваіх даходаў па выніках года павінны і тыя, хто на працягу 2016—2020 (пяці апошніх) гадоў прадаў іншым фізічным асобам другую кватэру або другі жылы дом, больш чым адзін садовы домік або гараж (зямельны ўчастак, машына-месца), якія належалі ім па праве ўласнасці. Гэта датычыцца таксама больш чым аднаго не завершанага будаўніцтвам капітальнага будынка, размешчанага на зямельным участку, выдзеленым для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садоўніцтва, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу.

Увага! Пры атрыманні на працягу 2016—2020 гадоў даходаў ад продажу **аднаго наймення** аб'екта нерухомасці, напрыклад у 2016 годзе — адной (!) кватэры, а ў 2019 годзе — аднаго (!) жылога дома, грамадзянін не абавязаны прадстаўляць падатковую дэкларацыю, бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

Даходы, атрыманыя ад выплатнага адчужэння атрыманых у спадчыну аб'ектаў такой нерухомасці, вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад перыядычнасці іх адчужэння на працягу пяцігадовага перыяду.

Таксама па выніках года дэкларуюцца даходы ад продажу аднаго і больш аб'ектаў нерухомасці, якія не адносяцца да не завершанага будаўніцтвам капітальнага будынка, размешчанага на зямельным участку, выдзеленым для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садаводства, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу, кватэры, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), дачы, садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), гаража, машына-месца, зямельнага ўчастка. Да такіх аб'ектаў адносяцца, напрыклад, гандлёвыя, офісныя і адміністрацыйныя памяшканні.

Ёсць, зноў жа, выключэнне з правіл. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба, незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

Неабходна дэкларацыю даходы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе.

АД «ЧУЖЫНЦАЎ» ЛІЧЫМ, АД СВАЯКОЎ — НЕ

Дэкларацыю неабходна даходы, атрыманыя на працягу 2020 года ў выніку дарэння ў выглядзе нерухомай маёмасці па дамове рэнты бясплатна ад фізічных асоб, па дагаворах, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, у памеры больш за 7 003 беларускія рублі ад усіх крыніц на працягу года. Выключэнне складаюць падарункі сваякоў. Яны вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

Асобамі, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, лічацца бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, прадзед, прабабуля, праўнукі, муж і жонка. У адносінах сваяцтва будуць блізкія сваякі мужа ці жонкі, уключаючы памерлых.

ДАХОДЫ З-ЗА МЯЖЫ

Спецыялісты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя фінансавыя паступленні, што былі атрыманы грамадзянамі за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны. Але папярэдне трэба вызначыць, што чалавек сапраўды быў прызнаны ў 2020 годзе падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (фактычна знаходзіўся на працягу мінулага года больш за 183 дні на тэрыторыі краіны).

Гэта могуць быць грошы ад работы па найме (кантракта), ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян, і іншае.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых там (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), залічваюцца пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які трэба заплаціць у Беларусі. Тут існуе адзін нюанс. Такі залік ажыццяўляецца работніку пры ўмове, што ён прадставіць дакумент аб атрыманым даходзе і ўтрыманым падатку, пацверджаны падатковым ці іншым кампетэнтным органам замежнай краіны.

Такое пацвярджэнне даецца фізічнай асобай альбо ў момант падачы падатковай дэкларацыі, альбо на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падатку, які быў аплачаны ў бюджэт замежнай дзяржавы.

КАЛІ БУДАЎНІЦТВА СПЫНЕНА

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацыі забудоўшчыкаў.

Эксперты міністэрства адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, абкладаюцца падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней была дадзена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэкларацыю таксама і даходы, якія былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры датэрміновым пагашэнні жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя падаецца ў тым выпадку, калі па ўнесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў праведзены маёмасны падатковы вылік.

Такі ж механізм прадугледжаны, калі адмяняецца вылік на даходы ў выглядзе лізінгавых плацяжоў, якія выплачаны па дагаворы фінансавай арэнды, што прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу — аднакватэрнага жылога дома або кватэры, у выпадках калі такі дагавор не завяршыўся выкупам маёмасці або ў дагавор былі ўнесены змяненні, якія выключаюць умовы выкупу прадмета лізінгу.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў летась такія грашовыя сродкі, абавязаны заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была выдзелена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

ВЯРНУЦЬ... ПАДАТАК

У нас ёсць і тыя, хто можа падаць у інспекцыю дэкларацыю з мэтай атрымання падатковых ільгот.

У прыватнасці, гэта датычыцца людзей, якія атрымлівалі ў мінулым годзе аўтарскія ўзнагароджанні або ўзнагароджанні за стварэнне, выкананне або іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, выплаты аўтарам вынаходніцтваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці. Дэкларацыю варта запоўніць таксама спартсменам і іх трэнерам, якія атрымлівалі даходы ад асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўлялася імі не ў рамках каманднага ўдзелу.

Якімі падатковымі льготамі (вылікамі) можа скарыстацца фізічная асоба?

Стандартныя падатковыя вылікі:

— у памеры 117 рублёў у месяц пры атрыманні даходу, які падлягае падаткаабкладанню, у суме, якая не перавышае 709 рублёў у месяц;

— у памеры 34 рублёў (65 рублёў) у месяц на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, навучэнцаў і студэнтаў дзённага аддзялення ці іншых утрыманцаў;

— у памеры 165 рублёў у месяц для асобных катэгорый фізічных асоб.

Сацыяльныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на навучанне (сваё, дзяцей, іншых блізкіх сваякоў);

— на выплату страхавых узносаў па дагаворах добраахвотнага страхавання.

Маёмасныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на будаўніцтва або набыццё ў Рэспубліцы Беларусь аднакватэрнага жылога дома або кватэры;

— у суме выдаткаў, панесеных на набыццё маёмасці, даходы ад продажу якога падлягаюць падаткаабкладанню;

— у памеры 20 % сумы даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, атрыманых ад адчужэння маёмасці.

Прафесійныя падатковыя вылікі:

— у суме выдаткаў на стварэнне аб'екта аўтарскага права;

— у памеры 20 %, 30 %, 40 % сумы аўтарскага ўзнагароджання;

— у суме выдаткаў, звязаных з удзелам спартсменаў і іх трэнераў у спартыўных спаборніцтвах, пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўляецца не ў рамках каманднага ўдзелу;

— у памеры 20 % сумы даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, атрыманых спартсменамі і іх трэнерамі ад ажыццяўлення асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах.

Для плацельшчыкаў, якія падаюць дэкларацыю выключна ў мэтах атрымання падатковых вылікаў па падаходным падатку, тэрмін яе прадстаўлення не абмежаваны 31 сакавіка.

Што трэба зрабіць, каб вярнуць падатак? Падаць у падатковы орган дэкларацыю за 2020 год. Да дэкларацыі абавязкова павінна быць прыкладзеная даведка ад падатковага агента (арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка) аб налічаным даходзе і ўтрыманым падатку па вызначанай форме. Пасля гэтага трэба адлюстраваць у падатковай дэкларацыі звесткі аб праве фізічнай асобы на атрыманне пэўных падатковых ільгот. Да дэкларацыі павінны быць прыкладзеныя дакументы, якія пацвярджаюць права грамадзяніна на атрыманне падатковых ільгот.

Пасля таго, як падатковы орган зробіць пераразлік падаходнага падатку і разлічыць суму падатку да вяртання, напісаць заяву на вяртанне падатку па форме згодна з дадаткам 19 да пастановы Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь ад 26.04.2013 № 14 «Аб ажыццяўленні падатковымі органамі адміністрацыйных працэдур і ўстанаўленні формаў дакументаў».

Вяртанне падатку ажыццяўляецца двума спосабамі:

— на рахунак, адкрыты ў банку, у тым ліку карт-рахунак;

— наяўнымі грашовымі сродкамі з касы банка, у якім абслугоўваецца падатковы орган.

Калі фізічная асоба жадае вярнуць падатак на свой банкаўскі рахунак, то ў заяве на вяртанне падатку неабходна ўказаць рэквізіты банкаўскага рахунку: нумар і тып рахунку, найменне банка, код банка, код валюты. На працягу 15 рабочых дзён з моманту падачы заявы на вяртанне падатку атрымаць грошы.

І НАПРЫКАНЦЫ...

Падатковую дэкларацыю цяпер можна падаваць у любой інспекцыі незалежна ад месца пастаноўкі на ўлік або ў электронным выглядзе праз «Асабісты кабінет падаткаплацельшчыка».

Падаходны падатак, вылічаны падатковым органам на падставе прадстаўленай фізічнай асобай падатковай дэкларацыі за 2020 год, падлягае выплаце ў бюджэт у тэрмін не пазней за 1 чэрвеня 2021 года. Аплаціць згаданы падаходны падатак можна і праз «Асабісты кабінет плацельшчыка».

Парушэнне тэрміну прадстаўлення ў падатковы орган дэкларацыі за 2020 год цягне накладанне штрафу ў памеры дзвюх базавых велічынь з павелічэннем яго на 0,5 базавай велічыні за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але не больш за 10 базавых велічынь. Для даведкі: з 1 студзеня 2021 года базавая велічыня складае 29 рублёў. Такім чынам, памер штрафу можа скласці ад 58 да 290 рублёў.

Парушэнне фізічнай асобай тэрміну аплаты падаходнага падатку (1 чэрвеня 2021 года), вылічанага на падставе прадстаўленай падатковай дэкларацыі за 2020 год, калі неаплачаная ці не цалкам аплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню, цягне накладанне штрафу ў памеры 15 % ад неаплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні. Такім чынам, памер штрафу складае ад 14,5 рубля і больш.

Сяргей КУРКАЧ.

Простая мова

ТАК І ЖЫВУЦЬ — ДУРНІЦА З РАЗУМНЫМ...

На адмысловай паштовачцы («Маёй палавінцы на Новы год») — два сімпатычныя мядзведзікі: «хлопчык» (у чырвоным каптанчыку, з падарункам) і «дзяўчынка» — сама пяшчота!
А зрэшты, галоўнае тут не малюнак, галоўнае — словы: на знешнім баку — «Мне вельмі падабаецца сустракаць з табой Новы год...», на ўнутраным — «...а яшчэ больш мне падабаецца сустракаць з табой кожны новы дзень!»
Так было, так ёсць. І — хочацца верыць — будзе!

НАЗАД ДАРОГІ НЯМА

Дзетак у Лены двое — сынок (у лютым яму чатыры) і дачушка (ёй два). «Цяжка?» — пытаем у маладой матулькі, якая гадуе малых без бабуляў-дзядуль. — «Ды не, — усміхаецца тая. — Мне муж дапамагае... Мы нават сварымся, каму з нас ноччу ўставаць. Ён хоча, каб я лішнюю гадзінку паспала, а я — каб ён». — «Малайцы! Вы так шкадуеце адно аднаго!» — «Ды не толькі... Мы яшчэ «на беразе», ну, да вяселля, дамовіліся, што дзеці ў нас будуць адразу і не менш, чым двое, што гэта — наш сумесны праект: вырасціць іх, у людзі вывесці... Вось і вядзём памалу».

...Дарогу б такім «праектантам»!

ДОБРА!

У прыяцеля дом як дом — можна сказаць, звычайны.

З незвычайнага — хіба кабінецік: з высокімі кніжнымі шафамі, са старым, яшчэ дзедаўскім рабочым сталом, з камп'ютарам і мноствам фотакарткак. Яны тут, здаецца, паўсюль...

На найбольшай — яшчэ давясельнай — гаспадар у абдымку з каханай дзяўчынай, побач, на трошкі меншай, — ён жа ды ўжо з дачушкай. Тая — маленькая, прыбраная — у яго на карку сядзіць, звесіўшы ножкі... Подпіс унізе: «Як добра сядзець у таты на шыі!»

...Добра настолькі, што вельмі многія дзеці, нават дарослыя, злазіць не хочуць.

ДОЎГ — НЕ ВЯРОЎКА

Горад. Раніца. У трамваі народу шмат. Побач — двое маладых мужчын.

— Ну, купіў сабе новую спальню? — пытае адзін.

— Купіў — на сваю галаву.

— Гэта чаму ж?

— Ды ў крэдыт... А як цяпер аддаваць?

...Кароткі дыялог, як ілюстрацыя да крылатага: «Добры рубель пазычаны, толькі спаць не дае». Нават на новым ложку.

«ВЫЙГРЫШ»

Праўдзівая «гісторыя»: два журналісты некалі, у мінулым стагоддзі, у камандзіроўку прыехалі, да старшыні райвыканкама зайшлі, прадставіліся:

— Холад...

— Голад.

— Хлопцы, вы б, можа, не разам? — насцярожыўся той старшыня. — Можа, хоць паасобку ездзілі б?

Зрэшты, тут не пра яго. І не пра іх. Проста...

Холад. Дом. Сцежка і паралельна ёй такая ж доўгая чарга ў банкамат. Займаем — з улікам дыстанцыі і міжволі назіраем: пара наперадзе — хлопец з дзеўкай. Маладыя, прыбраныя: у яркіх пухнатых куртках, у цёплых шаліках ды шапках... А ногі амаль што босыя.

— Кароткія да костачак шкарпэткі я магу яшчэ зразумець, — каментуе моду прыяцелька. — Іх, напэўна, мыць прасцей, парашку меней трэба. А вось кароткія порткі... Іх лягчэй не спэцкаць, ці што?..

Магчыма...

Як магчыма і тое, што час ды грошы, сэканомленыя цяпер на мыцці, потым могуць пайсці на беспатрэбнае — на лекі ад хвароб, нажытых па ўласнай дурноце.

ПРЫСМАК МЁДУ

Зяць Лявонаўны ў горадзе жыве, у яе, у вёсцы, пчальнік трымае. Клопатная справа, а таму ледзь вольная гадзінка, — ён за тэлефон: «Лявонаўна, я прыеду... Трэба пчол паглядзець».

«Трэба дык трэба», — згаджаецца цешча і пасля гэтага як нос не разаб'е: носіцца па хаце, па дварэ, па агародзе, каб усё прыбраць (госць жа), каб нешта прыгатаваць, каб з сабой яму сумкі злажыць...

— Мне ягоныя пчолы ўжо ў пячонках сядзяць, — пасля ад'ездаў (прычым з ранняй вясны да позняй восені) скардзіцца суседкам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І потым, узімку, таксама не маўчыць: таксама наракае, бо пчолы спяць, зяць... не прыязджае.

— Бабачкі, гэта ж з-за яго я так разленавалася, ну так разленавалася — анічога рабіць не хачу! — прызнаецца цешча. — На канапе днямі сяджу і думаю: ну хай бы ж ты, гад, пазваніў! Хай бы сказаў, што едзеш! Я тады б мігам...

Анекдот у тэму. «Я такая хворая, ну такая хворая, — жаліцца цешча зяцю. — Да вясны далібог памру!» — «Ну то глядзіце, мама: паабяцалі — самому Богу (!)».

ХТО ПОЙДЗЕ?

Раніца. Паліклініка. Доўгі калідор з безліччу людзей, з безліччу дзвярэй. На адных — надпіс: «Афтальмолаг». І чарга — з уласцівымі ёй размовамі:

— Катаракта ў мяне, — дзеліцца бядой адзін з дзядоў-пацыентаў. — На левае вока амаль нічога не бачу. І на правым аперацыю трэба рабіць. Добра, як добра, як пашанцуе, а як не? Страшна...

— Дык не рабі, — раіць яму другі з дзядоў. — Я сваю катаракту каторы час на кроплях трымаю...

— Хм, катаракта... Хваробу знайшлі, — бурчыць іх сусед па лаўцы. — У мяне глаўкома, халера на яе. Нічым не лечыцца!..

Як і варта чакаць, у размовы старых пра ўласныя хворасці ўступае крыху маладзейшы — з «аптымістычным»:

— Хлопцы, хваробы вачэй — усе цяжкія і дрэнныя тым...

— ?

— ...Што памрэш і не ўбачыш, хто пойдзе за труной, хто — не...

Дзяды маўчаць — не ўсміхаюцца (у адрозненне ад іншых «чаргавікоў»). Трэба разумець, думаюць, што добра было б пабачыць, хто сапраўды пойдзе, а хто, можа, і не.

ЦЯЖКІ ВЫПАДАК

У медыкаў работы за вочы, — не выпадае турбаваць, тым больш — па дрэнным.

Праўда, ёй, дрэнным, хвароба здавалася зранку, а вось пад вечар...

Пашчасціла, што «хуткая» прыехала хутка, што забрала адразу, але ж везла ну вельмі доўга! Што можна было зразумець: час пік, машын у горадзе многа, святлафораў таксама — дзе-нідзе прыйшлося стаяць.

— Можа, сірэну трэба ўключыць? — спыталі ў медсястры, што сядзела побач.

— Не той выпадак, — спакойна адказала дзяўчына. — Сірэна ўключаецца тады, калі хворы ўжо таго... Памірае...

Падбадзёрыла, карацей. І прасвятліла: дарогу для «хуткай» (гэта святое!) мы саступалі і так, цяпер жа — яшчэ здалёк...

Асабліва — калі з сірэнай..

ДУМКІ — ГЭТА АДНО...

Цётка Маркаўна ўсё жыццё «адтрубіла» ў калгасе, шмат старшынь перабачыла.

Найгоршы, кажа, апошні быў. Дзякуй богу, на пенсію адправілі... І жонка яго ў хуткім часе злягла. Так што сам ён цяпер (чаго ніколі не рабіў) пыніць гаспадарку і варыць есці, сам прыходзіць да Маркаўны па малако — прыгнуты, зблажэлы...

Цётка яму, як перад люстэркам:

— Глянь, Гардзеевіч, як мы зраўняліся: выглядаеш — амаль як я. А мусіць жа, не чакаў, не думаў, што так атрымаецца?

— Думаў, — бубніць сусед, — але не верыў.

ДУРНІЦА З РАЗУМНЫМ

Вёску разам з цяплом пакідаюць людзі. Спачатку дзеці, потым дачнікі, а нарэшце — «пералётныя птушкі»: адзінокія бабулі-дзяды, што на зімку з'язджаюць да дзяцей, каб потым, калі пашчасціць, вярнуцца...

У маркоце, у трывожным чаканні стаяць іх сялібкі, у беспрытульнасці гойсаюць сабачкі ды каты: ціснуцца да рэдкіх цёплых хат.

Туды ж, падобна, збягаюцца мышы. І «паганяць» немаведама як, бо труціць іх, здавалася, рызыка — для катоў...

Аж не! Ну ўбачце: з-за халадзільніка выпаўзае мыш, акурат як п'яная, улукаткі, «ідзе» ў бок печы, валіцца на бок, ледзьве ўстае, хістаецца, падае...

З крэсла за ёй, відавочна, атручанай, ва ўсе вочы назірае котка, потым саскоквае на падлогу, збівае мыш з «абранага курсу», грэбліва глядзіць, як тая падымаецца, лапай «футболіць» у кут за памыйнае вядро і вяртаецца назад на калені гаспадара. Які ў гэты ж час з асалодай пацягвае «Прыму».

Іншымі атрутамі таксама, на жаль, не грэбуе.

Так і сядзяць, так і жывуць побач homo sapiens (чытай: чалавек разумны) і дурная (?) котка.

КОЖНЫ ВЫБІРАЕ ПА САБЕ...

П'яны ў трамвай ледзь «запоўз» — прыступкі цяжка даліся... Затое потым спрытна плюхнуўся на сядзенне — ледзь не «прышчаміў» там невялічкага строгага дзядка.

Той зморшчыўся, адсунуўся да самай «сцяны» і ўжо адтуль распачаў вядомае: «Эх ты, малады, здаровы, а які занятак сабе знайшоў... Лепш бы нечым людскім заняўся. Іншыя, глянь (п'яны вухам не павёў), трамваі водзяць, дысертацыі пішуць, эканоміку падымаюць...»

— Што? — насцярожыўся раптам дзяцюк. — Эканоміку? Хай бы лепей пілі...

ЯК ЖЫЦЬ, ДЫК НА ВОЛІ...

Цётка Галя ў свае 80 з добрым хвастом зімуе ў сваёй хаціне, у вёсцы. Да дзяцей у горад з'язджала нават не раз, але хіба захварэўшы...

Неяк аж два месяцы пражыла. На пачатку размовы казала, як ёй добра было: і цёпла, і ўтульна, і весела (часам... Калі ўнукі збіраліся)...

Ды куды часцей, як потым прызналася, там турма турмой, нават камерай-адзіночкай, бо ў агульнай (камеры) хоць з нейкай зэчкай пагаварыў бы... А ў кватэры — зяць з дачкой на работу, і ты цэлы дзень адзін. Хоць воўкам завый: нікога не ведаеш, нікуды не выйдзеш, бо ўсюды жалезныя дзверы, замкі, дамафоны...

Адкуль — выснова (цётчына): як жыць, дык дай бог на волі, як паміраць — дык дома.

«КАМПЛІМЕНТ»

Горад. Ранак і рынак. Прадаўцоў і тавараў шмат, пакупнікоў — пакуль надварот. І тыя шыбуюць міма, калі іх не спыняць...

— Мужчыначка, — аклікае кагось маладая гандлярка, — давайце каўбаскі ўзважу... Свежачок! Толькі што прывезлі!..

(«Мужчыначка», падобна, «не чуе»).

— А гляньце, якая грудзінка ў мяне! — не змаўкае дзеўка.

Вось цяпер чалавек (досыць сталага ўзросту) спыняецца, як за што зачапіўшыся, — ва ўсе вочы глядзіць на гандлярку.

— Пакаштуеце? — тут жа прапануе тая, адразаючы тонкі скрылік і, вядома ж, «шчабечучы» далей. — Адно мяска, бачыце! І мяккаемяккае!.. Бярыце! Вам якраз па зубах!

...Вось пра гэта лепш не трэба было б, бо мужчыну — па тых самых зубах — як анучай ударылі. Ён пачырванеў, сагнуўся... Сышоў.

Прадавачка (з нажом, з мяккім скрылічкам) засталася стаяць — у чаканні новых кліентаў.

І, магчыма, у развагах — над тым, што трэба казаць, а што не.

Валянціна ДОЎНАР.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

ТЭМПЕРАТУРА, СЛАБАСЦЬ, СТРАТА НЮХУ...

Ці можна самастойна адрозніць COVID-19 ад іншых рэспіраторных хвароб і як западозрыць пнеўманію?

Каранавірусная інфекцыя застаецца галоўным рэспіраторным захворваннем апошніх месяцаў, ды і ўсяго мінулага года. Праўда, пасля пікавых лічбаў у лістападзе-снежні цяпер назіраецца хоць і невялікае, але зніжэнне. Частка бальніц, як у сталіцы, так і ў рэгіёнах, нават вяртаецца да звычайнага рэжыму работы. Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч у панядзелак адзначыў, што яшчэ да новага года спецыялісты ўбачылі ўстойлівую тэндэнцыю па зніжэнні захваральнасці, і яна назіраецца ва ўсіх рэгіёнах. Нават прынята рашэнне аб вывадзе некаторых стацыянараў з рэжыму работы інфекцыйных. У Мінску гэта 2-і радзільны дом і Рэспубліканская клінічная бальніца медыцынскай рэабілітацыі (Аксакаўшчына).

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пасля вялікіх выхадных цягам некалькіх дзён чакаецца рост зваротаў да медыкаў, што звязана з так званым адтэрмінаваным зваротам. Затым прагназуецца, што захваральнасць пойдзе на спад. Аднак рэзкага зніжэння чакаць не варта. «Мяркую, да сярэдзіны-канца лютага будзе падзенне, затым, магчыма, невялікі рост, звязаны з прыходам звычайных эпідэмічных захворванняў, у прыватнасці, грыпу. Але дзякуючы вакцынацыі (у гэтым эпідсезоне прышчэплена каля 40 % насельніцтва) пад'ём захваральнасці чакаецца невысокі», — адзначыў міністр.

Так ці інакш, COVID-19 працягвае непакоіць як новымі для рэспіраторнай хваробы сімптомамі, так і тым, што застаецца адной з самых небяспечных хвароб. Пра яго праявы, у тым ліку і тыя, якія павінны ўстрывожыць, лячэнне, у прыватнасці, дома, і сімптомы, што застаюцца праз тыдні і месяцы пасля хваробы, мы пагаварылі з доктарам, якая працавала ў выязной брыгадзе падчас першай хвалі і працягвае назіраць пацыентаў з ковід-інфекцыяй цяпер. На нашы пытанні адказала **ўрач агульнай практыкі, выконваючы абавязкі загадчыка 1-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й сталічнай паліклінікі Святлана ЯНУШКА.**

— Святлана Аляксандраўна, як адрозніць каранавірусную інфекцыю ад іншых рэспіраторных захворванняў? Якія ў яе спецыфічныя прыкметы?

— COVID-19 — гэта інфекцыйнае захворванне, узбуджальнікам якога з'яўляецца каранавірус, год таму выяўлены ў Кітаі. На раннім этапе хваробу складана адрозніць ад звычайнай сезоннай ВРВІ.

«Паказаннем для прызначэння антыбактэрыяльных прэпаратаў з'яўляецца далучэнне бактэрыяльнай інфекцыі, але ніяк не наяўнасць віруснай пнеўманіі пры КТ органаў грудной клеткі».

Асноўным адрозненнем каранавіруса ад грыпу і ВРВІ з'яўляецца інкубацыйны перыяд (час ад інфіцыравання да праяўлення першых сімптомаў). Рэспіраторныя вірусы і грып заяўляюць пра сябе ўжо на 1—4 суткі. У сярэднім іх інкубацыйны перыяд складае 2-3 дні. Каранавірусу для размнажэння ў арганізме патрэбна больш часу. Яго інкубацыйны перыяд можа дасягаць 14 дзён. Яўныя прыкметы хваробы ў большасці пацыентаў адзначаюцца ўжо на пяты дзень, але могуць з'явіцца і значна пазней.

Галоўныя сімптомы, уласцівыя каранавірусу, наступныя: непрадукцыйны зацяжны кашаль, павышэнне тэмпературы цела, часцей за ўсё да субфебрыльных лічбаў (37,0—37,5) на пачатковай стадыі хваробы, ламота ў мышцах і суставах, «пяршэнне» ў горле, галаўны боль, цяжкасці з дыханнем, задышка, адчуванне закладзенасці ў вобласці грудзей, дыярэйны сіндром або расстройства стулу, млоснасць, закладзенасць носа без слізістых выдзяленняў, анасмія (адсутнасць нюху), скурная высыпка.

— Дарэчы, ці можа пры каранавірусе захоўвацца нюх, або ён, як правіла, прападае?

— У 70—80 % хвароба суправаджаецца няздольнасцю адчуваць пахі і смакі на фоне закладзенасці носа без насмарку.

— Ці можна сказаць, што цяпер каранавірус менш небяспечны, чым вясной?

— Другая хваля каранавіруснай інфекцыі, якую мы перажываем цяпер, характарызуецца больш цяжкім цячэннем і нашмат большай колькасцю інфіцыраваных.

— Адной з прыкмет каранавіруснай інфекцыі з'яўляецца павышаная тэмпература, якая «скача». Ці можа з-за COVID-19 тэмпература, наадварот, паніжацца?

— Ваганні ў дыяпазоне ад нормы да субфебрылітэту характэрныя для ранняй стадыі хваробы. Часта гэты перыяд характарызуецца нарастаннем сімптаматыкі — з'яўляецца ламота ў суставах, павялічваецца слабасць, з'яўляецца задышка. Бывае, што да гэтых прыкмет далучаецца страта нюху і смаку. Калі падчас COVID-19 тэмпература цела трымаецца на 35,5 °С і ніжэй, гэта можа сведчыць аб розных спадарожных захворваннях, якія ў выніку могуць пагоршыць стан пацыента, нават калі ў яго лёгкая форма інфекцыі.

— Якімі прэпаратамі і ў якіх выпадках варта збіваць тэмпературу? Якія яшчэ лекі неабходна мець дома для барацьбы з COVID-19?

— Пры тэмпературы вышэй за 38,5 °С трэба прыняць парацэтамол 500 мг (яго доза павінна быць не больш за 3,0 г у суткі). Увогуле ж лекавыя прэпараты, неабходныя пацыенту для лячэння, прызначае ўрач зыходзячы з даных клінічнай карціны, аб'ектыўнага агляду і лабараторных даных. Пры лёгкім цячэнні хваробы дастаткова вялікай колькасці піцця і вітамінаў.

— У якіх выпадках патрэбныя антыбіётыкі?

— Паказаннем для прызначэння антыбактэрыяльных прэпаратаў з'яўляецца далучэнне бактэрыяльнай інфекцыі, але ніяк не наяўнасць віруснай пнеўманіі пры КТ органаў грудной клеткі.

— Якія прэпараты ні ў якім разе нельга прызначаць сабе самому?

— Найперш гэта датычыцца гармонаў, супрацьмалярыйных прэпаратаў, антыбіётыкаў. Паўтаруся, што ўсе лекі мусіць прызначаць доктар.

— Як пачынаецца пнеўманія пры COVID-19 і як можна самому яе западозрыць? Што ў такім выпадку рабіць? У якіх выпадках з пнеўманіяй патрэбна шпіталізацыя? Якія паказчыкі трэба кантраляваць пры лячэнні пнеўманіі дома?

— Асаблівасці каранавіруснай інфекцыі такія, што пнеўманія без тэмпературы сустракаецца нярэдка. Звычайна пры гэтым выяўленыя па КТ ачагі займаюць да 25 % лёгачных палёў. Замест тэмпературы могуць непакоіць слабасць, стамляльнасць, страта або прытупленне нюху, задышка ці цяжар у грудзях. Хоць і рэдка, але сустракаюцца сітуацыі, калі любыя сімптомы, у тым ліку тэмпература, адсутнічаюць.

Калі пасля таго, як высокая тэмпература (37,5-39 °С) трымалася некалькі дзён (ад двух сутак да тыдня), потым падала да 36-37 °С і зноў расла вышэй за 37,5 °С (да 38,5-40 °С), асабліва ў спалучэнні са з'яўленнем гнойнай макроты, можна меркаваць аб далучэнні да віруса бактэрыяльнай флоры.

З'яўленне задышкі, болю у грудной клетцы, падзенне ўзроўню сатурацыі ніжэй за 95 %, павышэнне тэмпературы да 39-40 °С — трывожныя прыкметы. У такім выпадку неабходна выклікаць урача на дом, а пры рэзкім пагаршэнні стану — брыгаду хуткай дапамогі.

— Як можна зразумець, што пнеўманія вылечана? Калі (і ўвогуле ці трэба) рабіць кантрольны здымак?

— Вылечанасць пнеўманіі вызначаецца ўрачом па розных крытэрыях, тэрміны яе вар'іруюцца індывідуальна. Неабходнасць і тэрміны кантрольнага абследавання гэтак жа вызначаюцца індывідуальна.

З самага пачатку пандэміі ахоўны касцюм стаў для ўрача Святланы ЯНУШКІ штодзённай неабходнасцю.

— За які тэрмін у сярэднім вылечваецца каранавірусная інфекцыя ў лёгкай і цяжкай формах?

— Тэрміны лячэння COVID-19 вар'іруюць ад двух тыдняў у лёгкай форме і да 3-4 месяцаў пры цяжкіх формах. У сярэднім гэта інфекцыя ў цяперашні час лечыцца каля месяца.

— Якія сімптомы COVID-19 могуць захоўвацца праз тыдні і месяцы пасля выздараўлення?

— У шэрагу пацыентаў сутачныя ваганні тэмпературы адзначаюцца нават пасля выздараўлення. Увогуле для каранавіруснай інфекцыі характэрны працяглы аднаўленчы перыяд, калі фіксуюцца розныя рэшткавыя праявы, у тым ліку трымаецца субфебрыльная тэмпература, часцей за ўсё ў вячэрнія і начныя гадзіны. Могуць быць павышаная стамляльнасць, патлівасць.

Часцей за ўсё каранавірус дае ўскладненні на сардэчна-сасудзістую сістэму, істотна павялічваецца рызыка развіцця інфарктаў, парушэнняў рытму сэрца, міякардыту, інсультаў, тромбаэмбаліі лёгачнай артэрыі. Практычна ва ўсіх пацыентаў адзначаецца паражэнне печані — змены яе функцый — і выяўляецца рост пячоначных ферментаў. З аднаго боку, гэта можа быць абумоўлена масіўнымі дозамі лекавых прэпаратаў, якія атрымліваюць пацыенты. З іншага — маюцца даныя, што вірус уплывае на страўнікава-кішачны тракт. Вядомыя паражэнні кішэчніка пры COVID-інфекцыі, а аднымі з праяў захворвання з'яўляюцца розныя кішэчныя сімптомы.

«Асаблівасці каранавіруснай інфекцыі такія, што пнеўманія без тэмпературы сустракаецца нярэдка. Звычайна пры гэтым выяўленыя па КТ ачагі займаюць да 25 % лёгачных палёў. Замест тэмпературы могуць непакоіць слабасць, стамляльнасць, страта або прытупленне нюху, задышка ці цяжар у грудзях».

У большасці пацыентаў, якія лечацца ад COVID-інфекцыі, узнікаюць пэўныя псіхалагічныя праблемы — дэпрэсія, трывога. Такім людзям сапраўды патрэбна дапамога псіхатэрапеўта. Прычым гэта не проста ўласна псіхалагічная праблема. Каранавірус можа паражаць цэнтральную нервовую сістэму, і развіваецца своеасаблівая ковідная энцэфалапатыя. Былі выпадкі ковіднага паражэння галаўнога мозга, ковіднага менінгіту і энцэфаліту.

— Цяпер больш вядома пра меры прафілактыкі, чым у часы першай хвалі. Як засцерагацца ад каранавіруса?

— Пазбягайце «трох К»: крытых памяшканняў, у якіх людзі трымаюцца кучна або кантактуюць. Вытрымлівайце сацыяльную дыстанцыю ў 1,5-2 метры. Кашляць і чхаць трэба ў згіб локця ці сурвэтку. Апошнюю адразу выкідваюць у кантэйнер для смецця. Ад тканевай насоўкі лепш адмовіцца. Абавязковым застаецца нашэнне маскі ў грамадскіх месцах. Таксама важна мыць рукі з мылам і апрацоўваць іх спіртаўтрымліваючымі антысептыкамі. А яшчэ не дакранацца да твару рукамі і не церці вочы.

Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР НА 2021 ГОД

Народны каляндар — гэта фальклорны каляндар, у якім захаваны прыродна-краналагічныя веды народа. У яго аснове хранонімы, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў.

Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы ў тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі/Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры.

У народным календары на 2021 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі.

У наступным, 2022-м, годзе па каталіцкай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 17 красавіка і па праваслаўнай — 24 красавіка.

Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у кнігах складальніка Алеся Лозкі «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 1993, 2002) і іншых.

Фота Анатоля КІЦІШУКА.

СТУДЗЕНЬ

1. пт. Новы год. ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе, Расія — у 1700 годзе.

6. с. Першая, Посная куцця. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богазʼяўленне, Тры Каралі.*** Каталікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

7. ч. Раство Хрыстова. Пачатак **Каляд**. «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...» Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

9. сб. Сцяпан. Дзень найму слуг, парабкаў у мінулым. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

13. с. Шчодрая куцця. Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».

14. ч. Васіле. Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

18. п. Трэцяя, Галодная, Вадапоская куцця. Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'яджае».

19. а. Вадохрышча (Кшчэнне). «Святое Кшчэнне ваду ксціла.., свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

20. с. Прывадохрышча — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. н. *Аксіння.* «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.** «На Фядоса цёпла».

25. п. Таццяна. Свята студэнтаў. ***Павел.*** «Вее вецер — будзе вайна».

31. н. Апанас, Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

ЛЮТЫ

1. п. *Ігнат.* «На Святога Ігната зіма багата».

2. а. *Грамніцы, Стрэчанне.* «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

5. пт. *Агата.* Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусцяць бяды да хаты».

6. сб. *Дарота.* «На Дароце высахнуць хусты на плоце». **Паўзімніца Аксіння.** «На Аксіння мяце».

11. ч. Ігнат. «Ігнат Грамніцам рад».

12. пт. *Стрэчанскія Дзяды.*

14. н. *Валянцін.* Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».

15. п. Грамніцы, Стрэчанне. «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася». «На Грамніцы палавіна зімніцы».

17. с. *Серада Папяльцовая (пач. Вялікага посту ў каталікаў, да 3.04).

18. ч. Агата. Каровіна свята.

24. с. *Мацей.* «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». **Уласее.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас».

26. пт. Фаціння. Заступніца ад хвароб (ліхаманак, трасцы і інш.).

САКАВІК

1. п. Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.***

4. ч. *Казімір.* «Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець».

5. пт. * Дзедава пятніца.

6. сб. *Памінальніца. Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве».

8. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень. Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Іллі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.

9. а. *Заляцанне на Масленым тыдні. **Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

10. с. *Лысая серада. Праталіны-залысіны.

11. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».

12. пт. *Цешчыны вечары. Рыгор. «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

13. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы). «Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі». ***Залвіцыны вячоркі. Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

14. н. *Масленіца. «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Развітальны,** або **Дараваны дзень. *Гуканне вясны.** «Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком. **Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** «На Аўдоці голы бокі». (1.03 Новы год / Новае лета, у мінулым сакавіцкі календарны стыль). «Святы Еўдакей... пераступ года».

15. п. *Паласказуб. Першы дзень Вялікага посту (да 1.05). Паласкалі зубы гарэлкаю. **Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».

17. с. *Уступная серада. Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і перакоквалі цераз пень. **Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».

19. пт. *Язэп. «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту» (забарона на шлюб). «На Язэпа пагода — год ураджайны».

20. сб. *Зборава субота. Абрад «споведзі дзежкі». *Веснавое раўнадзенства.*

21. н. *Зборніца, Ізбор. Адзін з варыянтаў Новага года/лета ў час прыняцця юліянскага летаслічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору селяніна ў поле.

22. п. Саракі. Было Новым годам/летам. Свята веснавога раўнадзенства. «Дзень з ноччу мераецца». «Святыя Саракі наперад пайшлі». Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». **Прыска.** «На святога Прыска праб'ець лёд і плісках».

25. ч. *Дабравешчанне, Звеставанне. «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам/летам. «Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць». **Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора».

26. пт. Міжблагавешчыны (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.

28. н. *Пальмова нядзеля. «Вярба б'е, не я б'ю».

29. п. *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі «храсты». Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна».

30. а. Аляксей Цёплы. Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

КРАСАВІК

1. ч. Дар'я Вясенняя. Адбельвалі палотны.

4. н.*ВЯЛІКДЗЕНЬ у каталікаў.

5. п. *Арына. «На Арыну сей капусту ў расадніках».

6. а. Камаедзіца. Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі «Буславы лапы».

7. с. *Серадапосце. Выпякалі «храсцы». **Дабравешчанне.** «Дабравешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».

8. ч. Благуста. «На Благусту сей капусту».

9. пт. Матрона. «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».

12. п. Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца».

14. с. Прабуджэнне хатніка. У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. «Апрэль — нікому не вер». **Мар'я.** Калі ў яснаю ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

15. ч. Палікарп. «Пачатак бясхлебіцы».

16. пт. *Пахвальная пятніца. Мыццё дзежак. **Мікіта.** «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».

17. сб. *Пахвальная субота. Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

21. с. Руф. Руф рушыць снягі.

23. пт. *Юры. (Новы год па задыяку). «Першае святца — святы Юр'я», «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». ***Войцах.** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

24. сб. Анціп — ахоўнік зубоў.

25. н. *Вербніца. *Марк.* «Дождж на Марка, дык зямля як скварка».

26. п. Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

27. а. *Чысты аўторак. Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць.

28. с. *Дравяная страсць. Мыюць усё драўлянае. **Пуд.** «Пуд снег пугне».

29. ч. *Чысты чацвер. Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі. **Арына.** «На Арыну сей капусту на расаду».

30. пт. *Чырвоная, Велікодная, пятніца. Сеялі гарох. **Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

МАЙ

1. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота. Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. **Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

2. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ. «Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!». Быў Новым годам. «Першае свята — свята Вялікадня».

3. п. Працяг ***Вялікадня.** «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паслядні дзень выпраўляюць».

5. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень. «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула». **Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады. «Благаславі, маці, / Ой, Лада, маці! / Вясну заклікаці».

6. ч. *Людавы дзень. Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйкі з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадою. **Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».

7. пт. *Прашчэнне. Абліваліся вадою. **Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

8. сб. *Станіслаў. «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як скварка». **Ярылавіца.** Свята Ярылы.

9. н. *Праводная нядзеля. «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла».

10. п. *Радаўнічныя Дзяды.

11. а. *Радаўніца. «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць».

13. ч. *Ушэсце. Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. **Якуб.** «На Якуба грэе люба».

14. пт. Макарэй. Абрады ля вады.

15. сб. Барыс. Апякун поля і жывёлы.

18. а. Арына Расадніца. Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

20. ч. Антоній. «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца».

21. пт. Іван Веснавы. Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

22. сб. Мікола Веснавы. Свята пастухоў. ***Алена.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

23. н. *Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух. Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха». ***Міраносцы.** «На Міраносця п'яныі бабы цягаюць адна адну за валосця». **Зілот.** «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злота».

24. п. Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

25. а. Епіфан. «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

26. с. *Градавая, Пераплаўная, серада. Засяжорыгі ад граду і дажджу.

27. ч. Сідары. «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

28. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень (Вілейская губ.). **Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

29. сб. *Троіца. Магдалена. «Магдалена зязюльку прысылае».

31. п. Шэсць дзеў. «Лён сей позні». **Капелька Матруна.** «У зямлю махнула». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

ЧЭРВЕНЬ

2. с. Тры пакутнікі. «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

3. ч. Алена, Ульяна. Дзень ільну.

4. пт. Васіліск. «Ад Васіліска і салавей блізка».

5. сб. Дзень Ефрасінні Полацкай. Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.

7. п. Ян. «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».

10. ч. *Ушэсце. Абрад «Страла».

13. н. Ерамей. *Антоній.* «Антоні, аддай коні».

14. п. Юстын і Харытон. «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён».

16. с. *Градавая серада. Лук'ян. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

18. пт. *Сёмушныя Дзяды.

19. сб. *Духавая субота, Зялёная субота. Свята маладой зеляніны. «Завівалі» вянкі, бяроскі.

20. н. *Сёмуха, Тройца. Культ продкаў і расліннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...».

21. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я. Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...». **Тодар.** «На Тодара раса — канапель паласа». *Летняе сонцастаянне.*

22. а. *Конскі Вялікдзень. Свята коней. **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

23. с. *Градабой, Серада Русаль. Здабывалі з ясеня святы агонь. ***Купала.*** У старажытнасці — Новы год/лета.

24. ч. *Наўская Тройца, Абліваха. Памінанне продкаў на могілках. ***Ян Купальны.*** «Сонца грае».

25. пт. Анапрэй. «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

26. сб. Акуліна Грачышніца. Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.** Каровы «зыкуюць».

27. н. *Русальчыны розыгрыш. Засцераганіся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі.

28. п. *Пятроўка, Петравіца. Пятроўскі пост да 11 ліп. Пятроўка-галадоўка. **Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».

29. а. Ціхан. «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

ЛІПЕНЬ

1. ч. *Дзявятнік. Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзеўяць ягодзін на ветцы».

2. пт. *Дзевятуха. Дзень засцеражэння ад навальніцы.

6. а. Купалле. Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».

7. с. Іван Купала. «Учора была Купала, а сёння Іван».

8. ч. *Дзясятнік. «Дзясятнік гнаі возіць». ***Данат.*** «Святы Данат коскі точыць».

9. пт. *Дзясятка. «Косы точыць». «Жыта паспявае».

10. сб. Самсон. «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». ***Сем братоў.*** «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

12. п. Пятро. Свята заканчэння Купалля.

13. а. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юды конь баіцца груды».

14. с. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе».

17. сб. Андрэй. «Авёс у свіцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

18. н. Свята Месяца. «Месяц гуляе».

21. с. Казанская, Градавы дзень. Засцераганне ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. **Пракоп.** Пракоп бок прыпёк.

25. н. *Якуб. «На Якуба хлеба поўна губа». **Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос.

26. п. *Ганна. Снапы кладзе. **Гаўрылей.** Засцераганне ад граду.

29. ч. Афіназен. Заціхаюць птушкі.

30. пт. Серпавіца, Шыпілінка (пятніца перад Ільёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў перад жнівом.

ЖНІВЕНЬ

1. н. Макрыны. «Глядзі восень па Макрыні».

2. п. Ілья. Свята дажджоў і навальніц. «Ільля нарабіў гнілля». «Укінуў у воду кусок ільда».

4. с. Мар'я. «Магдалена — вады па калена».

6. пт. Барыс Палікоп. «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

7. сб. Ганны. «Святы Ганны бабкі стаўляюць».

9. п. Палікоп. Паліць копы. **Панцеляймон.** Сцаляў ад хвароб галавы.

10. а. *Лаўрын. «На Лаўрына спяшай да мына».

12. ч. Сіла. Жыта сей.

14. сб. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 27 жніўня.

15. н. *Прачыстая, Зельная. «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста». **Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае».

16. п. Антоны Віхравеі. Рох. «Кірмаш на паненак» — дзень выглядання нявест.

17. а. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. ч. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. п. Лаўрэн — свята млынара. «Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень».

24. а. *Баўтрамей. «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

27. пт. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. сб. Прачыстая, Зельная. Свята ўраджаю.

29. н. Трэці Спас. Свята хлеба. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

30. п. Міроны Ветрагоны. «Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».

31. а. Флор і Лаўр. Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** Сухая навальніца, або дождж.

ВЕРАСЕНЬ

5. н. Лупа. «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

7. а. Баўтрамей. «Жыта на зіму сей».

8. с. *Другая Прачыстая. «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

10. пт. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. сб. Калінавік, Іван Крывавўнік. «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу».

13. п. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. а. *Узвіжанне. Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе Навалецце/Навагоддзе з 1493 г.). **Бабіна лета.**

19. н. Цуды, Міхал. «Міхал з поля спіхаў».

21. а. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі збожжавых. Засідкі.

22. с. *Асенняе раўнадзенства.

24. пт. Тадора. «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

26. н. Стаўроўскія Дзяды.

27. п. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.

29. с. *Міхал. «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». **Сіцыян.** «Святы Сацыян дні ляны пасціла».

КАСТРЫЧНІК

2. сб. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

3. н. Астап, Астаф'я. Прыкметы па ветры.

4. п. *Пранцішак, Францішак. «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

8. пт. Сяргей. «З Сяргея пачынаецца зіма». **Жалезны тыдзень.** Чысцілі жалезныя рэчы.

9. сб. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся свахі пра нявестаў. «Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова». «Святы Багаслоў да буракі капаў».

14. ч. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». **Дзявоцкае лета** (да 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сяброўкі.

21. ч. Трыфан, Палагея. «Золкім ветрам вее». ***Зміцер.*** «Да Змітра баба хітра».

25. п. Марцін — свята млынароў. Частаваліся гусяцінай на млынавым крузе. «Марцін святы — любіцель гагаты».

28. ч. *Сымон і Юда. «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на працу.

29. пт. Лонгін. Збавіцель ад хвароб вачэй.

30. сб. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. н. Лука. «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

ЛІСТАПАД

1. п. *Усе святыя.*

2. а. *Задушны дзень.* Памінальны дзень.

4. ч. Казанская. «Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі».

6. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды. «Святыя дзяды, завём вас...».

8. п. Зміцер. «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

9. а. *Тодар. «На Тадора поўна камора».

10. с. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. ч. Настуся. Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».

12. пт. Артошка. Пачатак прадзення.

14. н. Кузьма-Дзям'ян. Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

21. н. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

22. п. Матрона. «З Матроны становіцца зіма».

24. с. Хведар Студзянец. «Хведаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

25. ч. *Кацярыны. «Кацярына забрала лета». **Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў.

27. сб. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

28. н. Піліпаўка — перадкалядны пост (да 06.01).

29. п. Мацей. «На Мацея зіма пацее».

30. а. *Андрэйкі. Дзявочае свята.

СНЕЖАНЬ

4. сб. *Барбара. «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла». **Увядзенне.** Водзяцца ваўкі.

5. н. Пракоп. *Савы.* «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

6. п. *Мікола.* «Хвалі зіму па Міколе». **Матрыхваны.** Не пралі.

7. а. Кацярыны. «Забрала край лета».

9. ч. Юр'е Зімовы. Юра мосціць. ***Ганны.*** «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

13. п. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. а. Навум. «Наставіць на вум». Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.

17. пт. Варвары. «Мікола і Варвара ноч урвалі».

18. сб. Савы, Міколін бацька. «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

19. н. Мікола Зімовы. «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

21. а. *Зімовае сонцастаянне ў 15.59 г.*

22. с. Ганны. «Ганны — прыбавіцца багата дня». «Ганкі — палічаны дзянькі».

24. пт. *Посная куцця.* Пачатак Каляд (да 6 студзеня).

25. сб. *Божае Нараджэнне.* Было Новым годам. «Свята Ражаство упярод пашло, новы гадок павёў радок». **Спірыдон Сонцаварот.**

26. н. *Сцяпан.* Дзень найму парабкаў у мінулым. «Кожны сабе пан».

31. пт. *Багатая куцця. Сільвестр.* Варажылі дзяўчаты. **Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка».

Алесь ЛОЗКА, фальклярыст.

ПАРТЫЗАНСКІ ФРОНТ

У лістападзе 1978 года ў Савецкім Саюзе адбылася гучная адстаўка першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, Героя Сацыялістычнай Працы Кірылы Трафімавіча Мазурава. Гэтай падзеі папярэднічаў даклад старшыні КДБ Юрыя Андропава асабіста Брэжневу з нагоды паведамленняў пра Мазурава ў замежнай прэсе, дакладней, пра іх колькасць. Іх было шмат: «Рэйтэр», «Нью-Ёрк таймс», «Каррэрэ дэла сэра», «Асашыэйтэд прэс»... Газета «Крысчэн сайенс манітар» наогул на першай старонцы змясціла артыкул з гучнай назвай: «Мазураў робіць вялікі крок уверх па лесвіцы савецкай іерархіі». А яшчэ матэрыялы з папкі «Зусім сакрэтна» з радыёперахопамі, паведамленнямі «Бі-бі-сі». У іх Мазурава называлі ў ліку патэнцыйных пераемнікаў Брэжнева — ён значна маладзейшы, яму крыху за 60, энергічны і мае каласальны аўтарытэт у народа. Састарэлым правадырам было чаго баяцца.

«ТЫ ШТО САБЕ ДАЗВАЛЯЕШ?»

Але шлях Мазурава ў вялікую палітыку мог скончыцца так і не пачаўшыся. У канцы 1940-х скандал разгараўся вакол, здавалася б, малаважнага эпізоду. Цанава, міністр дзяржбяспекі БССР, атрымаў запрашальны квіток на ўрачысты сход з нагоды святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі... пад нумарам 600. Мерапрыемства рыхтаваў Мінскі абкам партыі, куды ўваходзіла і гарадская партарганізацыя. Яго нядаўна абраны першы сакратар Мазураў распарадзіўся выпісваць запрашальныя, як гэта прынята, па алфавіце. Але на практыцы дзейнічала іншае правіла: спачатку асобным спісам ішло кіраўніцтва згодна значнасці для рэспублікі, дзе Цанава быў у першых шэрагах, затым усе астатнія. А тут

Мазураў увесь час праводзіў у атрадах, катэгарычна не жадаючы ажыццяўляць кіраўніцтва са штаба — «балота», як яго называлі па месцы размяшчэння.

такое! Літаральна адразу ж у кабінеце Мазурава пачуўся званок. «Ты што мне даслаў? Які нумар на гэтым білеце — прачытаў?» Мазураў адказаў, што не мае звычкі глядзець на нумар. Але такі адказ ледзь не каштаваў яму пасады. «Прыкладна праз гадзіну Гусараў, першы сакратар ЦК КПБ, выклікае мяне на пасяджэнне бюро. Прыходжу. Члены бюро ўжо сабраліся, і Цанава там. Мяне пачынаюць груба выхоўваць: «Ты што сабе дазваляеш? Які білет даслаў Цанаве? Ён у нас — член бюро, чаму 600-ы нумар даслаў?» Тады заступіліся члены бюро, маўляў, малады, яшчэ навучыцца, хоць ведалі, што Цанава здольны на ўсё. У жыцці Мазурава потым будзе нямала сітуацый, калі даводзілася адстойваць свой пункт гледжання, інтарэсы рэспублікі. Гэта і жорсткае выступленне Кірылы Трафімавіча на пленуме ЦК, калі з падачы Берыі было пастаўлена пытанне аб зняцці з пасады першага сакратара беларускай партарганізацыі Патолічава. Заяву Мазурава падтрымалі практычна ўсе члены пленума: «Калі вінаватыя, здымаць трэба ўсіх, а не першага сакратара», і пытанне адклалі. Гэта і супрацьстаянне з Хрушчовым з нагоды рэформаў у сельскай гаспадарцы, якія вялі да знішчэння асабістай дапаможнай гаспадаркі, у цэлым галіны. Даводзілася адстойваць і размяшчэнне высокатэхналагічных вытворчасцяў на тэрыторыі рэспублікі, абараняць беларускую мову, помнікі і нават тых, хто перамог у крывавай вайне. З імем Мазурава звязана шмат спраў, ключавых рашэнняў для развіцця БССР і Савецкага Саюза, але барацьба за рэспубліку пачыналася менавіта з партызанскага фронту, хоць у біяграфіі Кірылы Трафімавіча згадваецца пра гэты перыяд толькі адным радком: «...з'яўляўся прадстаўніком ЦШПР у Беларусі». А ў яго рашэнні ад 30 верасня 1942-га гаварылася, што ён накіроўваецца «...у групу атрадаў Мінскай, Палескай, Пінскай і Баранавіцкай абласцей са спецыяльным даручэннем. Тэрмін — да спецыяльнага распараджэння». 42-гі, мабыць, — самы складаны перыяд для рэспублікі, калі супраціўленне як адзіны фронт яшчэ фарміравалася, калі не хапала элементарнага, каб супрацьстаяць моцнаму саперніку — зброі, адзення, медыкаментаў, ежы. З чаго пачыналася ўсенародная барацьба — у праўдзівых данясеннях Мазурава, пазыўны якога «Віктар». У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь іх захавалася больш за 200. У іх усё без перабольшанняў: пра подзвіг і пра здраду, пра тое, як усё было неадназначна, нават са стварэннем штаба партызанскага руху, аб мэтазгоднасці якога спрачаліся.

ПЛАНАВАННЕ АПЕРАЦЫЙ З ЦЭНТРА? АБСУРД!

Пра стварэнне штаба партызанскага руху Мазураў даведаўся значна пазней непасрэдна ад П. К. Панамарэнкі падчас адкрытай гутаркі з ім, запіс якой захоўваецца ў Нацыянальным архіве РБ (НАРБ). «Панамарэнка: «Берыя усімі сіламі стараўся пярэчыць стварэнню ЦШПР, грэбліва заяўляў, што «мужыкі ў лапцях» не могуць здзяйсняць дыверсіі ў тыле ворага. Для гэтага існуюць кваліфікаваныя воіны і сілы дзяржаўнай бяспекі». Сталін стварэнне штаба падтрымаў, але па кандыдатуры старшыні таксама спрэчкі. Хрушчоў настойваў на ўпаўнаважаным НКУС па Украіне. Гэта выклікала абурэнне Сталіна, які «ўстроіў наганяй» Хрушчову, нагадаўшы яму сур'ёзныя ваганні ў мінулым, прыналежнасць да трацкістаў», нагадаў і пра тое, што ў пачатку вайны створаныя на Украіне партызанскія атрады ўзначальвалі (у шэрагу выпадкаў) анархічныя элементы — «бацькі», якія адкрыта адмаўлялі кіруючую ролю партыйнага падполля і пры гэтым карысталіся падтрымкай Хрушчова». Тады сышліся на кандыдатуры Клімента Варашылава.

«П. Панамарэнка: «А той прывёў з сабой шмат генералаў-штабнікоў, якія ведалі ваенную справу, але не разбіраліся ў тым, што такое народная вайна. Гэтыя ваенныя, як і належыць ваенным, зараз жа ўзяліся за планаванне ўсялякага роду партызанскіх аперацый і кіраўніцтва ўсімі партызанскімі атрадамі з цэнтра. Гэта было абсурдам: пісаліся і аддаваліся дырэктывы і загады, але іх не было каму выконваць». Панамарэнка, ініцыятар стварэння штаба, накіраваў рэзкую запіску на імя Сталіна з гэтай нагоды, усё

Кірыла Трафімавіч Мазураў. 1944 год.

скончылася канфліктам з Варашылавым і ўмяшаннем Берыі. «Калі два адказныя кіраўнікі не могуць працаваць разам, трэба абодвух зняць». Сталін сказаў: «Тады прыйдзецца зняць трэцяга». «Каго ж?» — спытаў Берыя. «Цябе», — адказаў Сталін». У выніку ЦШПР узначаліў Панамарэнка.

ІДЭАЛАГІЧНАЯ ВАЙНА

Пра гэта ў першых данясеннях «Віктара» ў Цэнтр. «Тав. Зімяніну. Мы сядзім у лесе на поўдзень ад Альбінск — Любань. У атрадзе 50 камсамольцаў. У большасці не аформлены падпольныя арганізацыі. Атрадам патрэбна зброя, літаратура і ваенныя ў штаб. Гэта мая прыватная думка. Можа, меркаванне строгае, але як ваеннаму ўсё тут «рэжа вока». Пазарэз патрэбныя ўлёткі і ўсякая літаратура. Міхаіл, добрых прыкладаў таксама шмат, але я табе гэтага не даю. Гэта не галоўнае». У партызанскіх атрадах не хапае элементарнага і ў бытавым плане. «Жыву ў лесе і па начах ужо холадна. Дашліце да зімы што-небудзь на галаву і на ногі», «Міша (Зімянін), знайдзі мне сумку або планшэт, сшыткаў або нататнікаў, алоўкаў, компас, калі можна, боты, а то гэтыя худыя, ...патрэбныя касцюмы для Карповіча, Дзенісевіча (сувязныя на баранавіцкім напрамку) і што-небудзь цёплае. Яны выглядаюць абарванцамі». Практычна ў кожным лісце і шыфраграмах Мазурава аб недахопу інфармацыі — газет, літаратуры.

Ішла вайна ідэалагічная, у якой СССР на пачатковым этапе прайграваў. Разам з ваеннымі дзеяннямі немцы вялі масіраваную прапаганду. Асаблівую небяспеку ўяўлялі класна выкананыя фальшыўкі, напрыклад газета «Правда». Вонкава яна нічым не адрознівалася ад звыклай савецкай. Той жа фармат, шрыфт, але публікацыі правакацыйныя і ўжо ў духу фашысцкай ідэалогіі — пра крах савецкага тылу, пра палон неіснуючага сына Варашылава, пра тое, што Германія ратуе свет ад бальшавізму! Акрамя таго, пачало выходзіць каля сотні газет вялікімі тыражамі на беларускай і рускай мовах: «Беларуская газета» — 70 тысяч экзэмпляраў, газета «Новы шлях» і больш за 20 яе версій у рэгіёнах — «Новы шлях Бабруйска», «Новы шлях Гомеля», а яшчэ «Голас вёскі», разлічаная на сялян, «Беларуская школа». Акрамя крытыкі, у іх былі карысныя парады па земляробстве, бытавых праблемах. Але былі і «праколы». Да здзіўлення фашысцкіх ідэолагаў, самай папулярнай аказалася газета «Мінскер цайтунг» на нямецкай мове. Калі сталі разбірацца, чаму, высветлілася, што яна друкавалася на паперы добрай якасці, якая падыходзіла для курыва. Але напісанаму, на жаль, пачыналі верыць, бо іншай інфармацыі практычна не было. «У нашых раёнах (Палескай вобласці) немцы рабуюць насельніцтва бязлітасна, але і палітычную работу вядуць. Завалілі ўсе сёлы газетамі і часопісамі. Мы нічога не можам прапанаваць сялянам. Яны хацелі б хоць што-небудзь пачытаць з Савецкага Саюза, але мала вераць партызанам на слова. Патрэбна літаратура і выбухоўка». Неацэнную ролю адыгралі рукапісныя баявыя лісткі, насценгазеты, заклікі і нават газеты, часопісы, якія пачалі выпускаць у партызанскіх атрадах, — з'ява сама па сабе ўнікальная: самвыдатаўскую прэсу супрацьпаставілі масіраванай нямецкай прапагандзе. У маі 1942 года ў Мінску ў падпольнай друкарні пачалі выдаваць газету «Звязда». Гэта стала падзеяй і пачаткам выпуску друкаваных выданняў на акупаванай тэрыторыі.

РАДИОПЕРЕХВАТ

Радыёперахоп «Бі-бі-сі» «Аб дакладзе Кірылы Трафімавіча Мазурава». 10 лістапада 1968 года.

«ПАЛЯЎНІЧЫ» ПРОМЫСЕЛ

Але галоўным для Мазурава было ўзаемадзеянне партызанскіх атрадаў з ЦШПР па арганізацыі баявых дзеянняў у тыле ворага, работа з моладдзю, камсамольскія кадры і яшчэ шмат іншых пытанняў. Мазураў увесь час праводзіў у атрадах, катэгарычна не жадаючы ажыццяўляць кіраўніцтва са штаба — «балота», як яго называлі па месцы размяшчэння. У яго была рацыя — неймаверны скарб у той сітуацыі, гэта дазваляла аператыўна звязвацца з «Цэнтрам» і атрады адразу атрымлівалі зброю, медыкаменты, вопратку, прэсу. Аўтарытэт быў найвышэйшы. Пры гэтым Кірыла Трафімавіч прымаў непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях, разведцы. Пра дзейнасць партызан красамоўна кажуць яго данясенні, шыфроўкі ў «Цэнтр».

«Мы можам ганарыцца, што 8/10 усіх дыверсій на чыгунках робяць камсамольцы. Паспяхова ідзе «паляўнічы» промысел. Трое камсамольцаў Лівенцава на «паляванні» захапілі аўтамашыну з немцамі і прывялі ў лагер. «Паляўнічыя» брыгады Суворава выходзяць на Варшаўку ў лапцях, у падраным адзенні і ва ўпор расстрэльваюць сустрэчныя машыны. На Палессі па ініцыятыве камсамольцаў Жыгараўскай брыгады паспяхова выкарыстоўваецца метад абстрэлу цягнікоў. На днях група камсамольцаў абстраляла наліўны (з бензінам) эшалон, ён цалкам згарэў». Ці іншае паведамленне: «Мы ў снежні... займаліся падрывам цягнікоў. Уся бяда ў тым, што ў атрадаў няма ні выбухоўкі, ні боепрыпасаў. Становішча з боепрыпасамі цяжкае». Пытанне вырашалася ў тым ліку і за кошт атрадаў, што накіроўваліся ў тыл ворага з «Цэнтра» для выканання спецыяльных аперацый. Існавала меркаванне, што не партызаны ладзілі дыверсіі ў тыле, а спецыяльна падрыхтаваныя атрады. Такія сапраўды былі, і яны рэгулярна закідваліся на акупаваную тэрыторыю, але дзейнічалі разам з партызанскімі злучэннямі. Напрыклад, атрад аўтаматчыкаў імя М. Ф. Гастэлы, які быў сфарміраваны ў чэрвені 1942 года па рашэнні ЦК КП(б)Б, ЦК ВЛКСМ і Маскоўскага камітэта камсамола з камсамольцаў Масквы. У кастрычніку ён перайшоў лінію фронту і на працягу 43 дзён здзяйсняў рэйды па тылах ворага з паўночных раёнаў Беларусі ў паўднёвыя, дасягнуў Акцябрскага раёна Палескай вобласці і паступіў у распараджэнне камандавання партызанскіх злучэнняў Мінскай і Палескай абласцей.

У 1942-м — пачатку 1943-га партызанскі рух станавіўся добра арганізаваным, адзіным фронтам, у якім прымалі ўдзел у тым ліку падрыхтаваныя кадры для работы ў тыле. Іх рыхтавалі пяць цэнтральных спецшкол. Першая была створана ў студзені 1942-га рашэннем ЦК ВКП(б) для падрыхтоўкі партыйных і камсамольскіх работнікаў для падпольных органаў

КІРЫЛЫ МАЗУРАВА

і партызанскіх атрадаў. Асобая спецшкола № 105 пачала дзейнічаць у снежні 1942-га і рыхтавала намеснікаў камандзіраў партызанскіх атрадаў па разведвальнай рабоце. Трэцяя — Тэхнічная чыгуначная школа для арганізацыі дывэрсій у тыле Цэнтральнага і Заходняга франтоў. Таксама кадры для партызан рыхтавала радыёшкола і Вышэйшая аператыўная школа асобага прызначэння.

Выказваўся пункт гледжання, што ў партызанскія атрады заганялі ледзь не сілай. Пра гэта ў данясенні за 1942 год: «Пытанне аб рэзервах не заслугоўвае такой увагі, яно надуманае ў Маскве. Была б зброя, а ахвотных уступіць у партызаны шмат. У партызанскія атрады ўлілося б яшчэ больш насельніцтва, але не хапае зброі».

НЯМЕЦКАЯ АГЕНТУРА І ЛЖЭПАРТЫЗАНЫ

Але ў масавым прытоку насельніцтва таілася і небяспека. Адзін выпадак стаў сур'ёзным урокам для партызанаў, для штаба злучэння. Восенню 1942 года ў брыгадзе адважнага камандзіра Дзмітрыя Гуляева, якая дзейнічала ў раёне Лёзна, з'явілася прыгожая маладая жанчына. Яна паведаміла, што была ўдзельніцай падпольнай арганізацыі Мінска, але збегла з-за пераследаў фашыстаў, калі ў горадзе пачаліся арышты. Гуляеў, чыя брыгада асабліва дакучала немцам, не толькі паверыў ёй, але быў зачараваны яе прыгажосцю, шчырасцю. Неўзабаве яны зблізіліся, і да такой ступені,

Восенню 1942 года ў брыгадзе адважнага камандзіра Дзмітрыя Гуляева, якая дзейнічала ў раёне Лёзна, з'явілася прыгожая маладая жанчына. Яна паведаміла, што была ўдзельніцай падпольнай арганізацыі Мінска.

што камбрыг усюды вазіў яе з сабой, давяраў усе сакрэты, раіўся. А ён рэгулярна наведваў штаб на «балоце», прымаў сувязных, пры ёй планаваў аперацыі партызанаў. Да таго часу ў штаба ўжо былі сувязі з Мінскім падполлем, і Асобы аддзел вырашыў праверыць праз падпольшчыкаў, хто гэтая жанчына. Там паведамілі, што ніхто яе не ведае і яе версію не пацвярджаюць. Была выказана думка: ці не з'яўляецца яна агентам нямецкіх службаў бяспекі — СД, якіх рыхтуюць у Барысаве і накіроўваюць «у партызаны». І гэтая версія пацвердзілася. Калі Гуляеў з байцамі сышоў на заданне, яго грамадзянскую жонку запрасілі ў штаб. На першым жа допыце яна была выкрыта. Пацвердзілася інфармацыя і пра барысаўскую школу, дзе яна прайшла падрыхтоўку, а на допыце выдала агентуру. Выдаў правакатараў у Мінскім падполлі і яе сувязнік, які таксама знаходзіўся ў адным з партызанскіх атрадаў. Гэта дапамагло зберагчы ад бяды многіх мінскіх падпольшчыкаў. Але нямецкая разведка не толькі ўкараняла сваіх агентаў, а і выкарыстоўвала ўсе сродкі, каб дыскрэдытаваць партызанскі рух.

Восенню 1943 года групе партызанаў, якую ўзначальваў Мазураў, прыйшлося спыніцца ў невялікай

Узнагароджанне Кірылы Трафімавіча Мазурава ордэнам Леніна і залатым медалём «Серп і молат» Героя Сацыялістычнай Працы. 1974 год.

вёсцы паблізу Дняпроўска-Бугскага канала. Людзі сустрэлі іх з недаверам, а адзін з жыхароў заявіў: «Партызаны не шкадуюць людзей. А мы ж гатовыя аддаць ім усё, што маем». Размова была не з лёгкіх. Аказалася, што ў вёску некалькі дзён таму на тачанцы прыязджала чалавек 15, усе п'яныя, учынілі паўсюдна ператрусы, забралі цёплую вопратку, каштоўнасці, забілі старасту, хоць ім сказалі, што прызначылі яго партызаны, забралі свіней. Адзін селянін не аддаваў парсюка, тады ў яго застрэлілі карову... З ілжэпартызанамі разабраліся жорстка, але тых, хто дзейнічаў ад імя партызанаў, дыскрэдытуючы супраціўленне беларускага народа, на жаль, было нямала.

«...ГЭТА ТАКІ ЗБРОД...»

Пра калабарантаў, але не пра тых мірных жыхароў, якія, апынуўшыся на акупаванай тэрыторыі, вымушаны былі працаваць, каб проста выжыць, а пра тых, хто супрацоўнічаў з фашысцкім рэжымам, у данясеннях Мазурава ў «Цэнтр».

«Аб паліцыі. Паліцыя ўвесь час папаўнялася за кошт моладзі. Большая частка сышла па меркаваннях чыста бандыцкіх, частка абдураных і забраных сілком. Наогул гэта войска вельмі паганае. Партызаны распраўляюцца з імі бязлітасна. Зараз у паліцыі з'яўляюцца пажылыя. За кошт моладзі папаўнення няма, ды і наогул папаўнення няма. Гэта такі зброд, што з імі амаль няма чаго працаваць».

Пра «Саюз беларускай моладзі». «У Мінску і Слуцку праціўнік прыступіў да стварэння «Саюза беларускай моладзі». Гэта фашысцкая арганізацыя, якая ставіць мэтай выхаванне моладзі ў духу фашызму і падрыхтоўку дывэрсантаў, шпіёнаў і тэрарыстаў, ахоплівае ўзрост 10—20 гадоў. Фінансуецца дзяржавай. Падрабязныя звесткі — першым самалётам. Даём указанне ўсяляк зрываць камплектаванне арганізацый. Пасылаць у іх адданых партыі людзей для распаду. Забіваць і ліквідаваць кіраўнікоў «СС»-саставу. Прашу даць указанні і забяспечыць літаратурай па гэтым пытанні». Рэзалюцыя тав. Панамарэнкі: «Тав. Зімяніну. Трэба абдумаць, пытанне сур'ёзнае». Пытанне на пастаянным кантролі, інфармацыя паступае кіраўніцтву рэгулярна, з яе мы даведваемся аб рэальным стаўленні да прафашысцкіх арганізацый самой моладзі, насельніцтва.

З ліста за 16 ліпеня 1943 года. «Справа з фашысцкімі арганізацыямі ідзе так: пакуль немцы абмяжоўваюцца толькі гарадамі Мінскай вобласці і тое не зусім удала. У Слуцку адкрыта ўжылі гвалт да моладзі. 2–3 дні таму захапілі больш за 100 чалавек моладзі і замкнулі ў гета. Ходзяць чуткі, што сярод іх вядуць вярбоўку ў СБМ. Кіруе СБМ (шэф штаба) Міхаіл Ганько, жаночай секцыяй кіруе Абрамава. Што гэта за звяры — невядома».

З радыёграмы з Пінскай вобласці для П. Панамарэнкі і М. Зімяніна, 4 жніўня 1943 года.

«У Палескай і Пінскай абласцях арганізацый фашысцкага «Саюза беларускай моладзі» пакуль няма. Актыўна ідзе фарміраванне арганізацый у Слуцкай зоне. Па даных камсамольцаў-падпольшчыкаў, у Слуцк прызначаны акруговы і павятовы кіраўнікі СБМ. Немцы ўзмоцнена праз газету і з дапамогай улётак агітуюць моладзь. Асаблівая работа — вярбоўка сярод інтэлігенцыі (асабліва настаўнікаў). Завербаваным выдаюць амуніцыю і грашовае ўтрыманне. Канспіратыўна ідзе падрыхтоўка да стварэння сеткі падпольных арганізацый СБМ, рыхтуюцца кадры. Сярод актыву маюцца нашы людзі. Сувязь з імі і агентуру будзем пашыраць».

Вынік дзейнасці нацыяналістычных фарміраванняў — таксама ў данясеннях. Беларускімі нацыяналістамі «Самаабароны», «Беларускай Краёвай Абароны» (БКА), 1-й Беларускай Грэнадзёрскай брыгадай СС «Беларусь», якія пад бел-чырвона-белым сцягам праводзілі карныя аперацыі супраць партызанаў, мірных жыхароў, знішчана: «в. Бабровічы Целяханскага раёна, спалена ўлетку 1942 года. Расстраляна і спалена 1300 чал., засталося 7–8 сем'яў»; «Спаленыя ў Брэсцкай вобласці в. Зыбайлы, Жытлін, Карэчын, Хадакі»; «в. Мілевічы, спалена 530 чал., в. Беразнякі 280 чал., в. Морач — 250. Дзяцей кідалі ў агонь. У Хварастове спалены царква і святар Лойка Іван Сямёнавіч, 60 гадоў. Прамяні — спалена 100 дамоў». І гэта толькі некаторая страшная статыстыка. Пасля Кірыла Трафімавіч пісаў: «Акупанты, у тым ліку і нацыяналістычныя фарміраванні, разбурылі і спалілі 209 з 270 гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу, больш за 9 тысяч вёсак, без жылля засталося каля 3 млн жывых».

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

Кірыла Мазураў лічыў сваім абавязкам зрабіць усё, каб праўда пра партызанскі рух перамагла, а імёнамі герояў ганарылася краіна. Ён дамогся рэабілітацыі Мінскага падполля і яго кіраўнікоў, удзельнікі якога былі абылганыя і абвешчаныя здраднікамі. І пачынаў гэта рабіць у 1950-м, у разгар кампаніі па шальмаванні падпольшчыкаў, калі самому можна было патрапіць пад раздачу.

Невыпадкова ўзнікла і ідэя паставіць помнік усім спаленым вёскам. Да гэтага падштурхнуў выпадак: падчас прагулкі па лесе за пяцьдзясят кіламетраў ад Мінска па Віцебскім напрамку Мазураў, тады першы сакратар ЦК КПБ, і Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, старшыня Савета Міністраў рэспублікі, выпадкова натрапілі на зарослую быльнягом раллю. У цэнтры поля на ўзгорку яны ўбачылі спаленую вёску. «Дзясяткі два абгарэлых пячных труб, нібы помнікі, уздымаліся да неба. Ад саміх двароў і дваровых пабудоў амаль нічога не засталося. Недалёка мы ўбачылі невялікі статак кароў. Прыглядаў за імі пажылы чалавек. Падышлі, разгаварыліся. Ад пастуха пачулі страшную гісторыю пра трагічную гібель вёскі Хатыні і яе жыхароў». Тады ж было прынята рашэнне ўвесці мемарыял. Але за яго давялося змагацца ўжо на ідэалагічным фронце. Гэта быў пазапланавы аб'ект, а такога роду аб'екты фінансаваліся з саюзнага бюджэту. Рашэнне знайшлі: у дакументах паказалі яго як памятны знак. Які быў скандал, калі ўзведзены мемарыял убачыла Фурцава, перадаць складана. Вердыкт адназначны — «пад бульдозер!». Па ідэалагічных меркаваннях рашэнне, прапанаванае архітэктарамі Ю. Градавым, В. Занковічам, Л. Левіным і скульптарам С. Селіханавым, ды яшчэ падтрыманае Пятром Міронавічам Машэравым, было проста жахлівае. Узор — узведзеныя манументы ў Маскве, іншых гарадах, а тут такое! У Маскве Мазураву прыйшлося ў Пасткаме БССР арганізоўваць абмеркаванне праекта, які ў канчатковым выніку падтрымалі запрошаныя супрацоўнікі ЦК, асабіста сакратар Іван Капітонаў, а потым супакойваць Фурцаву, якая так і засталася пры сваёй думцы. Беларусь жа атрымала ўнікальны мемарыял, а яго стваральнікі былі ўдастоены Ленінскай прэміі.

Кірыла Трафімавіч Мазураў *(злева)* на прывале з партызанамі.

Бітвы за помнікі, мемарыялы прыйшлося вытрымаць і ў дачыненні да Брэсцкай крэпасці, манумента Перамогі ў Мінску, які, нягледзячы на прынятае яшчэ 3 ліпеня 1945 года рашэнне аб яго ўзвядзенні на Цэнтральнай плошчы насупраць будынка ЦК КПБ, наогул прыйшлося адкласці. Партыйнаму кіраўніцтву строга ўказалі на палітычную блізарукасць — у сталіцы не было ніводнага помніка Сталіну — і гэта ва ўмовах, калі набліжалася 70-годдзе правадыра. Узводзіць яго сталі ў аўральным рэжыме на тым жа месцы замест планаванага абеліска Перамогі. Конкурс, абмеркаванне — усё пад асабістым кантролем Цанавы. Помнік Сталіну, унікальная ў творчым плане работа Георгія Заборскага, у сталіцы адкрылі за некалькі месяцаў да смерці правадыра ў 1952 годзе. Мітынг працоўных сталіцы вёў першы сакратар Мінскага абкама партыі Кірыла Трафімавіч Мазураў. Ён тады і ўявіць не мог, што неўзабаве трэба будзе вырашаць яшчэ адну досыць складаную задачу — аб зносе гэтага самага помніка правадыру. А задача сапраўды аказалася не з лёгкіх — усё было зроблена капітальна і, што называецца, на стагоддзі, патрабаванне Пастановы ЦК выканана дакладна: бронза, граніт, п'едэстал, які сыходзіць на пяць метраў углыб. Спатрэбілася нямала намаганняў, каб знайсці рашэнне, як ачысціць плошчу ад непажаданага манумента. Манумент жа Перамогі адкрылі 4 ліпеня 1954 года на Круглай плошчы, куды ён гарманічна ўпісаўся, — да дзесяцігоддзя вызвалення Мінска, урачысты мітынг вёў Кірыла Трафімавіч Мазураў ужо як Старшыня Савета Міністраў БССР.

Але, мабыць, галоўным вынікам дзейнасці Мазурава стала яго ініцыятыва аб стварэнні Усесаюзнай Кнігі Памяці, прапанаваная ім ужо ў перыяд, калі ён узначальваў Усесаюзны савет ветэранаў вайны і працы. Яна ўскалыхнула літаральна ўсю краіну, над зборам матэрыялаў працавалі людзі розных узростаў, прафесій, нацыянальнасцяў. Яна і сёння ўнікальная, і не толькі таму, што ўвекавечыла памяць мільёнаў савецкіх людзей. У ёй адноўлена гістарычнае мінулае многіх гарадоў, вёсак. Кніга Памяці стала праўдзівай гісторыяй вялікай краіны, напісанай самім народам, працягваць пісаць якую будуць ужо наступныя пакаленні.

Наталля ГОЛУБЕВА,
кандыдат гістарычных навук.

Правілы здароўя

Нясушка небяспекі

Названы небяспечныя для чалавека часткі курыцы

Ужыванне ў ежу пэўных частак курыцы можа негатыўна адбіцца на здароўі чалавека. Пра гэта паведаміў кітайскі партал Sohu.

Па словах экспертаў, на курынай грудцы шмат бактэрый і паразітаў, таму залішняе ўжыванне гэтай часткі птушкі дрэнна ўплывае на здароўе. Акрамя таго, варта адмовіцца ад ужывання курыных лёгкіх, паколькі там таксама ўтрымліваецца шмат паразітаў і бактэрый, якія не гінуць пры тэрмаапрацоўцы з-за сваёй устойлівасці да высокіх тэмператур.

Таксама адзначаецца, што ў курынай галаве могуць назапашвацца небяспечныя для здароўя чалавека рэчывы, а ў курынай скуры няма амаль нічога карыснага: яна багатая на тлушч і на яе паверхні шмат бактэрый.

У 2019 годзе анколагі з Оксфардскага ўніверсітэта заявілі, што ўжыванне мяса курыцы і іншых відаў птушкі можа павышаць рызыку развіцця раку прастаты, лімфомы і злаякаснай меланомы.

Свая хваля

Разрадам па выкідах

Прыдуманы спосаб выратавання гарадоў ад загазаванасці

Навукоўцы Інстытута агульнай фізікі (ІАФ) РАН прапанавалі выкарыстоўваць адкрыты імі новы від мікрахвалевага разраду для знішчэння аўтамабільных і прамысловых выкідаў. Пра гэта распавёў «Известиям» загадчык лабараторыі газакінетычных з'яў у ЗВЧ-разрадзе ІАФ РАН Ігар Косы.

«Мы адкрылі новы від разраду, які праводзіцца тым жа самым мікрахвалевым выпраменьваннем, але яго фізіка адрозніваецца ад фізікі вядомых газаразрадных працэсаў», — растлумачыў ён.

Адкрыццё назвалі «самападтрымлівальны несамастойны разрад» (СНР). Даказаць яго эфектыўнасць навукоўцы вырашылі на пробах, узятых у Лефортаўскім тунэлі ў Маскве. Гэта адзін з самых загружаных напрамкаў у горадзе, дзе праязджае да 8 тысяч аўтамабіляў у гадзіну. Высветлілася, што выкіды можна знішчаць і непасрэдна ў атмасферы.

Так, супрацоўнікі ІАФ РАН ачысцілі паветра, узятае ў гадзіну пік у гэтым тунэлі. Пасля апрацоўкі ўтрыманне шкодных рэчываў у пробе скарацілася ў два-шэсць разоў.

У новай тэхналогіі знішчэння шкодных выкідаў ёсць значныя перавагі перад існуючымі. Самая важная з іх — універсальнасць. СНР-разрад можа спальваць любыя віды шкодных рэчываў, а сённяшнія метады выкарыстоўваюцца толькі ў дачыненні да асобных тыпаў забруджвальнікаў. Таксама новы спосаб ачысткі дазваляе сэканоміць на электраэнергіі. Паводле падлікаў распрацоўшчыкаў, для ачысткі аднаго кубічнага метра паветра спатрэбіцца ўсяго 0,005 кВт/г.

Эксперты лічаць выкарыстанне мікрахвалевага выпраменьвання для ачысткі паветра перспектыўным, але заўчасным. Справа ў тым, што навукоўцы маюць намер прымяняць для ініцыяцыі СНР-разраду выпраменьванне міліметровага дыяпазону частот не толькі ў камеры, але і ў адкрытай прасторы. Даўжыня хвалі, якая выкарыстоўваецца, — 4 міліметры — вельмі высокачастотны дыяпазон, уздзеянне ваганняў якога на жывыя арганізмы можа быць істотнае нават пры малых магутнасцях і пакуль толькі даследуецца.

У глыбінях акіяна

Пагроза кітападобным

Аказваецца, касаткі часта гінуць праз чалавека

Аўтары навуковай работы спадзяюцца, што сабраныя даныя дазволяць распрацаваць прыродаахоўныя меры для іх абароны ад чалавечай дзейнасці.

Касаткі на паўночным усходзе Ціхага акіяна часта гінуць у выніку сутыкнення з суднамі, а некаторыя з іх хварэюць з-за праглынутых рыбалоўных кручкоў. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты, піша N+1.

Каманда навукоўцаў на чале са Стывенам Раверці з Міністэрства сельскай гаспадаркі Канады вырашыла высветліць, з якімі пагрозамі сутыкаюцца касаткі на паўночным усходзе Ціхага акіяна, дзе жыве некалькі папуляцый гэтых кітападобных: пяць драпежных, чатыры рыбаедныя, адна афшорная і гавайская.

У аналіз увайшлі 53 выпадкі гібелі касатак рознага ўзросту, з якіх у 22 выпадках прычыну смерці ўдалося дакладна ўстанавіць. Па меншай меры, чатыры асобіны, якія адносяцца да розных узроставых груп, памерлі з-за чалавечай дзейнасці, тры з іх — у выніку сутыкненняў з карпусамі і вінтамі суднаў. Яшчэ ў некалькіх касатак выявілі сляды падобных сутыкненняў.

Новыя даныя сведчаць, што фактар смяротнасці з-за інцыдэнтаў з караблямі і маторнымі лодкамі можа сур'ёзна ўплываць на некаторыя нешматлікія папуляцыі, якія насяляюць раёны з ажыўленым суднаходствам.

Адзначаецца, што да гібелі касатак прыводзілі не толькі антрапагенныя прычыны. Дзве асобіны памерлі з-за інфекцый, а яшчэ некалькі нованароджаных і немаўлят — з-за прыроджаных паталогій.

Таксама навукоўцы адзначылі ў некаторых загінулых касатак пашкоджанні, звязаныя з рыбалоўным промыслам, напрыклад праглынутыя кручкі (у адной маладой асобіны ў выніку развіўся сепсіс, які прывёў да гібелі).

Супраць стрэсу

Выхад для мозга

Вызначаны спосабы пазбаўлення ад начных кашмараў

Гэта рэгулярныя фізічныя нагрузкі і зніжэнне ўзроўню стрэсу, расказаў у гутарцы з «Вечерней Москвой» прафесар, доктар медыцынскіх навук Раман Бузуноў. Па словах самнолага, таксама не варта злоўжываць кафеінам і праводзіць шмат часу за чытаннем навін.

«Паглядзелі навіны 15 хвілін раніцай — не трэба больш маніторыць інфармацыю, каб не пагаршаць стрэс. Паглядзіце ў акно, пагуляйце па магчымасці», — сказаў прафесар. На думку Бузунова, «каб добра спаць, трэба добра пражыць дзень».

Ён дадаў, што кашмары, якія бачаць у сне людзі, падзяляюцца на дзве катэгорыі. У першым выпадку чалавеку перыядычна сняцца розныя сюжэты, якія з'яўляюцца своеасаблівым прайграваннем сітуацый, «калі мозг спрабуе знайсці выхад». Калі сітуацыя вырашаецца, ён адаптуецца і забывае аб тым, што здарылася.

«Другая катэгорыя — дакучлівыя кашмары. Чалавек рэгулярна вяртаецца да страшнага сну і не можа прыняць рашэнне, забыцца і адаптавацца», — расказаў спецыяліст. Паводле яго слоў, апошняя сітуацыя патрабуе дапамогі псіхолага.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з адкрытых крыніц.

Гарачае «прывітанне» ад печы і абагравальніка

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асабліва важна гэта ў халады. Справа ў тым, што ў цёплую пару года людзі выходзяць, як правіла, курыць на вуліцу. Але ў халады лянота лішні раз апранацца. Таму месца для курэння перамяшчаецца ўжо ў кватэру. А далей уключаецца так званы ланцужок дапушчэнняў. Маўляў, нічога страшнага, калі пакурыць у туалеце, на кухні, у спальні і, у рэшце рэшт, у ложку. Нярэдка гэта суправаджаецца і ўжываннем спіртнога. Рука слабее, чалавек пачынае драмаць, падпаленая цыгарэта спускаецца ўсё ніжэй і ніжэй і, нарэшце, судакранаецца з тканінай. Апошняя пачынае паступова тлець і разгарацца. І калі ў кватэры няма спраўнага аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка, то чалавек вельмі моцна рызыкуе больш не прачнуцца.

— Што да прычын, якія займаюць сумныя другое і трэцяе месцы, то «серабро» — у печак, цеплагенеруючых агрэгатаў і прылад, якія або няправільна ўстаноўлены, або эксплуатуюцца з парушэннямі правілаў бяспекі, — працягвае Віталь Навіцкі. — З натуральных прычын, іх колькасць з калянулявой адзнакі ў летні перыяд «свечкай» падскоквае ўверх, калі за акном тэмпература ўжо зімовая. Агулам на гэтую прычыну прыходзіцца прыкладна кожны шосты пажар у Беларусі. Крыху ад гэтага адстае няправільная эксплуатацыя электрычных сетак і абсталявання з 15,4 % агульнай колькасці пажараў.

Праўда, пажары праз самаробныя абагравальнікі ўсё радзей трапляюць у зводкі ратавальнікаў. Ледзь не апошняя інфармацыя датычыцца 2019 года. Два гады таму ў вёсцы Малая Падзер, што на Случчыне, загарэўся жылы дом. Супрацоўнікі МНС вынеслі адтуль на свежае паветра гаспадара, якога шпіталізавалі з апёкамі і атручэннем чадным газам. Агонь добра пагуляў па хаце: ён знішчыў перакрыцце, пашкодзіў сцены і дах па ўсёй плошчы дома. І прычынай гэтай бяды стаў менавіта самаробны абагравальнік.

— Так, ацяпляльныя апараты, зробленыя саматужным, а не фабрычным чынам, амаль сышлі ў гісторыю, — кажа суразмоўнік. — Але і выпушчаны на заводзе абагравальнік можа таіць у сабе небяспеку. Асабліва гэта датычыцца старэнькіх прыбораў, якія ўжо адпрацавалі вызначаны вытворцам тэрмін. Справа ў тым, што ў пагоні за больш нізкім коштам нярэдка ў ахвяру прыносіцца трываласць апарата. Ставяцца больш бюджэтныя кампаненты, больш тонкія правадкі... І менавіта таму тут прынцып «пакуль працуе, хай працуе» можа стаць фатальным. Таму лепш абагравальнік у старэнькім узросце проста выкінуць, а замест яго набыць новы. Тым больш што сучасныя прыборы маюць разнастайныя ступені абароны ад пажару. Некаторыя вытворцы прадугледжваюць вельмі карысную функцыю: калі на абагравальнік нешта пакласці, то ён аўтаматычна выключыцца, каб не справакаваць пажар.

А вось перанапал печы — на жаль, сітуацыя ўжо не такая рэдкая. Чалавечая логіка працуе так: калі на дварэ стаяць істотныя маразы, то трэба тапіць печку ўвесь час, каб дом не астыў. І якраз-такі ў гэтым і ёсць фатальная памылка. Тое, што дапушчальна, напрыклад, для цэнтральнага ацяплення (батарэі ў гарадскіх кватэрах гарачыя ж увесь час), не працуе з печкай...

Уначы 16 снежня ратавальнікі ў Любанскім раёне атрымалі паведамленне аб тым, што ў вёсцы Ямінск гарыць жылы дом. Агонь закурыў столь, пашкодзіў бялізну, якая знаходзілася на ляжанцы печы. У доме ў той час былі гаспадыня і яе дачка. Іх жыцці выратаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які і разбудзіў дзвюх жанчын. Прачнуўшыся, яны ўбачылі, што адбываецца, і паспрабавалі затушыць агонь самі. Пасля пакінулі дом і пазванілі ратавальнікам. Меркаванай прычынай пажару стаў менавіта перанапал печы...

— Па нашых даных, праз няправільную эксплуатацыю печак гінуць часцей за ўсё людзі ў сталым веку, — працягвае Віталь Навіцкі. — Усё-такі ў людзей ва ўзросце ўжо не зусім добра з кардынацыяй рухаў. Ды і з жыццёвага досведу часам робяцца абсалютна няправільныя вывады. Маўляў, калі ў мінулыя гады ўсё рабілася пэўным чынам і было добра, то гэта мае права на існаванне. Маю на ўвазе адсутнасць прыпечнага металічнага ліста, наяўнасць шчылін у корпусе печы. Таму мы заклікаем сваякоў, пакуль не надышлі моцныя халады, яшчэ раз упэўніцца, што вашы пажылыя сваякі зімуюць з бяспечнай печкай. А ў ідэале лепш за ўсё забраць да сябе бабуль і дзядуляў на перыяд халадоў.

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях таксама нагадалі, што ў халады печку трэба прапальваць не бесперапынна, а некалькі разоў на дзень і не пакідаць яе без нагляду, у тым ліку і на ноч.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

«ПЕСНЯРЫ»: РАЗМОВА З ЧАСАМ

Здаецца, што Юрый ІВАНОЎ захоплены, улюбёны ва ўсіх сваіх герояў, якія патрапіліся яму на шляху, якіх выбрала пільнае да адметнасцяў часу, да каларытных, цікавых людзей вока фотаапарата. Настолькі выразныя, вобразныя, рэльефныя, прыцягальныя яго здымкі, што кожны з персанажаў выклікае сімпатыі, праз якую хвіліну ад першага знаёмства падаецца добра вам вядомым, застаецца ў памяці. І кожны са здымкаў уяўляецца сапраўдным адкрыццём.

«Песняры», увесь ансамбль, Уладзімір МУЛЯВІН, Уладзіслаў МІСЕВІЧ і многія іх паплечнікі на розных этапах як асабіста для мяне прадстаюць у сённяшнім часе праз здымкі Юрыя Іванова. Ён здымаў музыкаў безліч разоў. У Мінску і іншых куточках краіны. Большасць здымкаў і друкавалася безліч разоў. На старонках перыядычных выданняў, у розных каталогах, кнігах. Як толькі здараюцца юбілей які ці якая іншая нагода — адразу шукаюць фотаздымкі «Песняроў» у Юрыя Іванова.

Юрый Сяргеевіч з задавальненнем прыгадвае гісторыі многіх прафесійных і сяброўскіх сустрэч з Уладзімірам Мулявіным. Асабліва ўражвае адна з іх, калі ініцыятыва фотакарэспандэнта прывяла ансамбль у Мсціслаў, на Мсціслаўшчыну. Калектыў быў у самым росквіце славы, збіраўся на далёкія і важныя з матэрыяльнага пункту гледжання гастролі. Усе канцэрты былі спланаваны. Білеты гледачамі ўжо куплены. Юрый Сяргеевіч, які ўжо адкрыў старажытны гарадок на памежжы Беларусі і Расіі, захапіўся ім, рыхтуючы ілюстрацыі да кніжнага выдання нарыса пра Мсціслаў, папрасіў «Песняроў» паехаць з ім. Чакалі і людзі ў гарадку, чакалі мясцовыя ўлады. Хацелася ўбачыць і пачуць... І Мулявін прымае няпростае рашэнне адмовіцца ад гастрольных абавязацельстваў. Прымае літаральна ў адно імгненне. У выніку — і дынамічнасць кнізе была нададзена, і «песняроўскія» здымкі з Мсціслава засталіся на дзесяцігоддзі, а мо і на стагоддзі наперад. Уражваюць і зараз занатаваныя фотакарэспандэнтам спевы «Песняроў» з фальклорным калектывам, вясковымі жанчынамі, здымкі ў каларытным атачэнні беларускіх краявідаў...

Аглядаючы сёння, праз пэўны час пасля здымак, мноства яго «песняроўскіх» кадраў, шмат хто неаднойчы выказваў думку пра патрэбу выдання фотальбома Юрыя Іванова, прысвечанага ансамблю, прысвечанага Уладзіміру Мулявіну. Будзем жа спадзявацца, што неўзабаве такая шыкоўная кніга з'явіцца на свет. І героі здымкаў, і іх аўтар, несумненна, заслугоўваюць гэтага.

Мікола БЕРЛЕЖ.
Фота Юрыя ІВАНОВА.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 27 января 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–10) ранее опубликован в газете «Звязда» от 15.10.2020 г. № 201(29315), www.bankrot.gov.by.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 января 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 25 января 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты, связанные с организацией и проведением торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 15.10.2020 г. № 201(29315).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 28.01.2021 аукциона по продаже имущества СУП «Могилевская специализированная передвижная механизированная колонна»

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 700/С-322 – здание автошколы, пл. – 573,3 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-674 – здание склада**, пл. – 45,5 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-672 – здание заправочной**, пл. – 38,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91123 – навес металлический**, пл. 153 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91122 – асфальтированная площадка**, пл. 912 кв. м. **Котел водогрейный газогенераторный ТЭМ-100**, зав. номер – 658, инв. 4200250, г. в. – 2008. **Котел КЧУ-7-63А-90Гн/ЛЖ «Эффект»**, инв. № 4200251. Лот № 1 расположен по адресам: г. Могилев, пр-т Димитрова, 19д, 19Д/1, 19Д/2, пр-т Димитрова (на территории Могилевского автокомбината по пр-ту Димитрова, 3, Могилевский автокомбинат) на земельных участках с кадастровыми номерами 740100000007000287 (право постоянного пользования, пл. 0,6483 га) и 740100000007006012 (право постоянного пользования, пл. 0,1148 га).

Начальная цена продажи: 124 176,00 бел. руб. с учетом НДС.

Аукцион состоится 28 января 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 09.11.2020.

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

Частное предприятие «Газосиликат Люкс»
извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества –
ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ
с инвентарным номером 700/D-89715, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 3 км - № 1
12 февраля 2021 г. в 10.00
по адресу: Могилевский р-н, Вейнянский с/с, д. Затишье, тел.: 77-77-05, 8-029-740-22-67.

УНП 812002492

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Стройгаз, г. Брест»

Предметы торгов	Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1 – Погрузчик-экскаватор ТО-49Е, год выпуска – 2004 г., регистрационный знак АК-1 6744	12 240,00	612,00
